З надыходзячым Новым годам!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 СНЕЖНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 254 (30388)



Фота БелТА.

# «Паехалі!»

## Мінчане і госці сталіцы атрымалі каштоўны навагодні падарунак — Прэзідэнт даў старт новым станцыям Мінскага метрапалітэна

**У сталіцы ўчора адкрылі тры новыя станцыі трэцяй лініі метрапалітэна. Будаўніцтва гэтага ўчастка «зялёнай веткі», які складае 4,08 кіламетра, было пачата ў жніўні 2017 года. А завяршэнне дадзенага ўчастка трэцяй лініі забяспечвае хуткай транспартнай сувяззю з іншымі раёнамі жылыя раёны Курасоўшчына і Мінск-Свет. Падарунак для мінчан і гасцей сталіцы надзвычай каштоўны. Напрыклад, дзякуючы адкрыццю новых станцый працей дабрацца да бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ці РНПЦ траўматалогіі. У гэтых раёнах жыве шмат маладых сем'яў, паездкі з дзецьмі цяпер стануць лягчэйшымі. І самі станцыі зроблены так, каб людзям было камфортна: ёсць ліфты, пандусы, месца на платформах хопіць усім. Першым пасажырам на новых станцыях «Аэрадромная», «Немаршанскі сад» і «Слуцкі гасцінец» стаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

СТАР. 2—3













ISSN 1990 — 763X

# «Паехалі!»



Фота БелТА.

## ЛЮДЗІ КРЫЎДЗІЦЦА НЕ ПАВІННЫ. ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ — СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

Кіраўнік дзяржавы пачаў з праблемных пытанняў. Ён згадаў, што жыхары мікрараёна «Мінск-Свет» скардзіліся на забудоўшчыка, і пацікавіўся, як цяпер ідуць справы з будоўляй у гэтым раёне. Прычым Прэзідэнта цікавілі не толькі жылыя дамы, але і інфраструктура. Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў, што 123 дамы ўжо пабудаваны, яшчэ 27 — у рабоце. Забудоўшчык узводзіць за свой кошт школу і фінансавы цэнтр. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Камітэт дзяржаўнага кантролю выявіў у гэтага забудоўшчыка сур'ёзныя парушэнні, за што той выплаціў вялікія штрафы. «Патрабаваць павінны з усіх жалезна. Галоўнае — гэта людзі», — запатрабаваў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу на яшчэ адзін вельмі важны аспект у жыцці грамадзян — вялікія сеткавыя крамы і крамы крокавай даступнасці. Задача кіраўніцтву Мінска — ні ў якім разе не дапусціць таго, каб сеткі выцеснілі невялікія магазіны, зручныя для людзей. Уладзімір Кухараў адзначыў, што ў Мінску каля сямі тысяч магазінаў крокавай даступнасці і кожны год іх колькасць павялічваецца. «Няхай прырастаюць, маленькія магазіны, бліжэй да людзей — гэта трэба», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што адказным асобам неабходна сачыць за тым, каб у кожнай краме людзям было зручна. У цэнтры ўвагі і пытанне цэнаўтварэння. Галоўны крытэрый — справядлівасць. «Людзі крыўдзіцца не павінны. Цэнаўтварэнне павінна справядлівым быць. І так, каб бізнесмены і людзі, якія гандлююць і вырабляюць, не бегалі за вамі: «Дазвольце нам павысіць, дазвольце тое, дазвольце гэта...» Яны самі павінны ведаць, у якім калідоры яны дзейнічаюць. Таму разам з бізнесам сядайце і выпрацоўвайце. У першых чыслах студзеня далажыце», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

## ТРЭБА ХУТЧЭЙ. У ДВА РАЗЫ

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў аб перспектывах сталічнага метрапалітэна. Па яго словах, гэта самы мабільны від грамадскага транспарту. У 2024 годзе адносна да 2023 года колькасць перавезеных пасажыраў вырасла на 8 працэнтаў, сёлета сталічная падземка перавезла 249 мільёнаў чалавек. Мяркуецца, што новыя станцыі трэцяй лініі дапамогуць павысіць гэту лічбу да 260 мільёнаў. Выручка ад рэалізацыі паслуг у 2024 годзе дадала 12 працэнтаў, а прыбытак прадпрыемства — 10 працэнтаў.

**«Мы пачынаем праектаванне чацвёртай лініі — гэта кальцавая лінія метро. 25 кіламетраў і 17 станцый запланавана па генплане. Мы плануем з улікам вялікага мікрараёна «Паўночны бераг» і мікрараёнаў, дзе жывуць звыш 800 тысяч чалавек (гэта Фрунзенскі і Маскоўскі), пасля завяршэння Парку Дружбы народаў (станцыя трэцяй лініі, якая яшчэ будуецца) будзем пачынаць з гэтага боку», — сказаў Уладзімір Кухараў.**

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідзе будаўніцтва раёна «Паўночны бераг». Па словах кіраўніка Мінгарвыканкама, усё ідзе па плане і ў рабочым рэжыме. А ў працяг тэмы кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на будаўніцтва Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, размешчанага менавіта ў тым раёне. «Я не стаў вас прыспешваць па адкрыцці. Але хачу папярэдзіць, што выставачны цэнтр павінен быць ад дзвярэй да канферэнц-залы пабудаваны, як яны, інвестары, абяцалі. Гэта за іх цана, і ніякіх адступленняў тут быць не можа. Там добры праект, таму ўсё трэба зрабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што трэба прывесці ў парадак і «зялёныя зоны» ў тым раёне. «Выставачны цэнтр павінны здаць пад ключ: і стаянкі, і асвятленне — усё-ўсё... Гэта ж замежная кампанія будуе. Калі мы з Прэзідэнтам у Эміратах абмяркоўвалі гэту тэму (ён мяне ініцыятыўна спытаў, як яны працуюць), я не стаў удавацца ў дэталі, сказаў, што працуюць добра. Таму ўсё павінны зрабіць як належыць. Каб да 9 мая ўвесь комплекс быў зроблены. Тое, што яны абяцалі мне, — запатрабаваў Прэзідэнт. — Да ўсіх аднолькавае стаўленне. Мяне Сі Цзіньпін таксама папярэдзіў: калі толькі, кажа, нашы дрэнна працуюць, скажы мне. А то яны бегаюць вакол і пачынаюць нешта даказваць: хто там бліжэй да Прэзідэнта, хто далей. Бліжэй за ўсіх да Прэзідэнта ў Мінску — гэта ты (старшыня Мінгарвыканкама. — **«Зв.»**) і мінчане».

Што датычыцца будаўніцтва метро, то, па словах Прэзідэнта, у цэлым усё добра, але катастрафічна марудна. Ён звярнуў увагу, што ў Маскве такія работы праводзяцца значна хутчэй. «Трэба хутчэй. Удвая», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў расказаў, што, каб актывізаваць будаўніцтва новых станцый, плануецца купіць другі праходачны шчыт «Алеся». Ён таксама адзначыў, што будаўніцтва трох новых станцый абышлося ў 832 мільёны рублёў, адзін кіламетр у эквіваленце каля 70 мільёнаў долараў.

**«Нікуды не падзенемся. У Мінску метро трэба рабіць сапраўднае, добрае», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што айчынную школу будаўніцтва метро трэба будзе пашыраць — у будучыні неабходна пракладваць наземнае метро ў гарады-спадарожнікі. «І няхай яны гэта будуць, метрабудаўцы. Добрыя яны спецыялісты, але робяць марудна», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Уладзімір Кухараў падкрэсліў, што на хуткасць могуць уплываць і пытанні фінансавання. Але, як трапна заўважыў Прэзідэнт, чым хутчэй будуюць, тым больш эканомяць. «Будзем старацца фінансаваць як мае быць. Але калі б ты сказаў, што кіламетр не 70 мільёнаў, а 50 каштуе — усё, Зорка Героя табе. Але пакуль 70», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.**

## ЯКАСЦЬ — ГЭТА ЎЖО ЗВЫЧКА НАШАГА НАРОДА

Прэзідэнту падарылі безлімітны праязны ў метро, якім ён адразу скарыстаўся. На станцыі «Аэрадромная» яго чакалі супрацоўнікі метрапалітэна і «Мінскметрабуда». Размову Аляксандр Лукашэнка пачаў з традыцыйнага адказу на пытанне: навошта прыехаў. Бываючы ў працоўных калектывах, ён заўсёды тлумачыць, чым выклікана яго цікавасць да таго ці іншага прадпрыемства. Нагоду для наведвання метро кіраўнік дзяржавы выбраў асаблівую — Новы год.

**«Да Новага года мы заўсёды дорым нашым людзям нейкі падарунак. І чым лепшы ён, чым багацейшым выглядае, тым больш задаволены нашы людзі. Я прыехаў для таго, каб не толькі ад свайго імя, але і ад вашага павіншаваць нашых людзей, асабліва мінчан, гасцей сталіцы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Адразу хачу сказаць, каб вы не зазнаваліся, я папярэдзіў мэра Мінска і ваша кіраўніцтва: рабіце правільна, добра, без усялякіх празмернасцяў. Не трэба пад зямлю заганяць палацы. Лепш мы зробім станцыі годна, прасцей, але больш, больш пабудуем станцый метро».**

Прэзідэнт заўважыў, што кожны дзень метрапалітэн перавозіць каля 700 тысяч людзей — гэта амаль трэць насельніцтва Мінска. Але трэба імкнуцца да большай лічбы. «Мінск павінен быць добрым, даступным, прыгожым горадам. Сапраўдны сталіцай нашай краіны», — сказаў ён.



Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як калісьці яму прапаноўвалі метрапалітэн закрыць, метро не будаваць: вельмі дорага. «Павінен вам сказаць, што я сур'ёзна над гэтым думаў, паколькі грошай не было. Але ўсё-такі Гасподзь тады мне падказаў, і я сказаў: не, будзем па метру будаваць у год, у дзень, але метрабуд трэба захаваць, таму што гэта школа. Калі б мы яе тады закрылі, сёння ўсе разбегліся б. Моладзь у будаўніцтва пад зямлёю не ішла б. І мы не ўмелі б будаваць метро, як гэта ў многіх дзяржавах свету. Не ўсе, далёка не ўсе і не многія дзяржавы сёння займаюцца падобным будаўніцтвам пад зямлёй. Гэта складана, гэта школа, вы лепей за мяне гэта ведаеце», — расказаў ён. Таму, па словах беларускага лідара, дзякуючы захаванню гэтай школы, сёння беларусы могуць будаваць кіламетры метро, што вельмі нятанна. І гэта работа будзе працягвацца.

Прэзідэнт расказаў і пра далейшыя планы ў гэтай сферы: «Мы павінны злучыць Мінск з гарадамі-спадарожнікамі. Мы не будзем забудоўваць Мінск, як гэта робяць іншыя гарады, і пашыраць Мінск за кальцавую дарогу. Задыхнецца Мінск, і мінчанам будзе агідна жыць у гэтым горадзе. Таму было прынята рашэнне будаваць гарады-спадарожнікі. Але іх трэба злучыць хуткаснымі трасамі. Таму будзем планаваць і прыглядацца да таго, каб пабудаваць метро наземнае, не пад зямлёй. Хто гэта будзе рабіць? Вы гэта будзеце рабіць». Таму, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, калектыў метрабуда ў чатыры тысячы чалавек — гэта толькі пачатак, трэба падвойваць. Ён зрабіў акцэнт, што будаўніцтву метро трэба ўдзяляць больш увагі і людзі, якія працуюць у гэтай сферы, пакрыўджанымі быць не павінны.

«Я вельмі рады, што вы добра працавалі. Марудна. Але якасна, добра», — падсумаваў Прэзідэнт. Ён анансаваў, што наступная пяцігодка будзе прысвечана якаснаму будаўніцтву, якаснай працы.

> **«Рыхтуйцеся да гэтага. Няякасна не будзе. Любы Прэзідэнт, якога выберуць, усё роўна будзе накіраваны на якасць. Гэта ўжо звычка нашага народа — чысціня, якасць. Гэта — галоўнае наша дасягненне і нашы брэнды. Да гэтага рыхтуйцеся», — заявіў беларускі лідар.**

Ён падзякаваў усім работнікам метро за тое, што перад Новым годам ёсць магчымасць зрабіць людзям такія падарункі.

## МЕТРО ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ

Кіраўнікі мінскага метрапалітэна і «Мінскметрабуда» Аляксей Шылаў і Васіль Касавец падзякавалі Аляксандру Лукашэнку за шматгадовую падтрымку развіцця метро. Кіраўнік «Мінскметрабуда» перадаў Прэзідэнту сімвалічны ключ ад новых станцый. А кіраўнік дзяржавы, у сваю чаргу, перадаў яго дырэктару метрапалітэна. «Мы, работнікі метро, зробім усё для камфорту і бяспекі нашых пасажыраў», — запэўніў дырэктар метрапалітэна Аляксей Шылаў.

На цырымоніі таксама выступіў ветэран метрапалітэна Іван Аўсянік, які кіраваў першым цягніком сталічнага метро. Ад імя калектыву ён уручыў Прэзідэнту памятны падарунак — кнігу, выдадзеную да 40-годдзя з дня пуску Мінскага метрапалітэна. «На ветэрана не цягне. Ён сам яшчэ можа цудоўна кіраваць такімі прыгожымі і магутнымі цягнікамі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Але цяпер Іван Аўсянік займаецца падрыхтоўкай маладых кадраў. Кіраўнік дзяржавы падзяліўся сваімі ўспамінамі, звязанымі з метрапалітэнам. Так, адзін з першых суботнікаў праводзіўся на месцы будаўніцтва метро ў Партызанскім раёне сталіцы — трэба было даць штуршок будаўніцтву метро.

Другі ўспамін, якім падзяліўся Прэзідэнт, не такі радасны — спыненне метро ў канцы 1990-х. «Я быў зусім яшчэ маладым Прэзідэнтам, калі вашы бацькі мяне выбралі. І ў нас катавасія была прыстойная. Калі б не міліцыя, то наўрад ці вытрымалі б — там машыны пераварочвалі і іншае-іншае. І вельмі актыўна тагачасная апазіцыя карысталася «паслугамі» метрапалітэнаўцаў. Я памятаю, угаварылі (дрэнная старонка, гэта не паказваюць) вашых бацькоў выступіць у падтрымку апазіцыі і спынілі летам метро. Усе людзі на паверхні. Натуральна, аўтобусаў не хапала, усяго тады не хапала», — расказаў Прэзідэнт. Асобна ён звярнуў увагу, што машыністы метро тады атрымлівалі зарплату ў 3—5 разоў вышэйшую за сярэдні заробак па краіне. «Мінск запрудзіў народ. Страшна было глядзець на вуліцы. Але я сказаў: «Нікому не кланяцца». Ні ў якім выпадку. Не хочуць працаваць — не трэба. Але ў той жа час я разумеў, што метро павінна працаваць», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Па дапамогу звярнуліся да чыгуначнікаў. Спачатку яны сумняваліся: маўляў, машыністы наземных цягнікоў не змогуць ездзіць пад зямлёй, не змогуць вытрымліваць інтэрвал. Але кіраўнік дзяржавы настаяў на тым, што метро павінна працаваць, і чыгуначнікі паехалі па рэйках пад зямлёй.

«Я ў Доме ўрада тады размяшчаўся. Гляджу, ідзе вялікая колькасць людзей. Наперадзе — мужыкі, ззаду — жанчыны. З мяцёлкамі, палкамі, гоняць перад сабой мужыкоў. Я пытаюся: «Што такое?» А гэта жонкі выганяюць машыністаў на працу. Я кажу: «Не, яны не хочуць працаваць. Не хочуць — не трэба». І дні тры я забараніў браць іх на працу», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Некалькі дзён ім не дазвалялі выйсці на працу. «Вы сышлі — сыходзьце! Як сёння збегліся. З'ехалі за мяжу. Пасудамыйкамі ім прапанавалі працаваць — дактарам, настаўнікам. — «А мы не хочам пасудамыйкамі». — «Ну, тады ідзіце на вуліцу...» Просяцца назад. Таму стварылі пад кіраўніцтвам Генпракурора камісію — ідзіце, тлумачце. Калі не падрывалі, не падпальвалі метро, крый божа, прыязджайце, працуйце. Але калі здзейснілі правапарушэнне або закон парушылі — адказвайце. Вось дакладна так было з машыністамі», — згадаў кіраўнік дзяржавы.

Вяртаючыся да тых падзей з забастоўкай у метро, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, калі машыністам у хуткім часе дазволілі вярнуцца да працы, гэта былі самыя надзейныя, самыя адданыя, самыя моцныя людзі. «З тых часоў у мяне ніколі не было праблем з метрапалітэнаўцамі, — падсумаваў беларускі лідар. — Вось я прыгадваю гэты выпадак, калі машыністы хацелі паказаць, што без іх нічога існаваць не можа. Будзе існаваць! І без машыністаў, і без будаўнікоў, і без Прэзідэнта гэтага. Свята месца пуста не бывае. Усё будзе існаваць. Таму памятайце гэта і шануйце гэтыя метры не толькі пад зямлёй, але і наверсе, дзе давядзецца жыць нам і нашым дзецям».

Толькі пытаннямі метро кіраўнік дзяржавы не абмежаваўся. Ён падрабязна распытаў у мэра Мінска пра будаўніцтва, добраўпарадкаванне старых і новых раёнаў сталіцы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ПАЛЁТ, ЭКАЛОГІЯ І ГІСТАРЫЧНЫ СТЫЛЬ

Кіраўнік дзяржавы разам з супрацоўнікамі метрапалітэна праехаў па трох новых станцыях і агледзеў кожную з іх. На трэцяй лініі метрапалітэна прадугледжаны сучасныя тэхналагічныя рашэнні, высокая аўтаматызацыя працэсаў кіравання і кантролю інжынернага абсталявання, укаранёны інтэлектуальныя сістэмы кіравання рухам цягнікоў, аплаты праезду, пажарнай бяспекі, новыя сродкі перадачы і апрацоўкі даных аб рабоце ўсіх сістэм метрапалітэна. Вельмі важна, што каля 90 працэнтаў абсталявання і матэрыялаў, выкарыстаных пры будаўніцтве, беларускай вытворчасці.

Кожная новая станцыя вызначаецца сваім дызайнам, дэманструе пэўную ідэю. Напрыклад, «Аэрадромная», якую першай наведаў Прэзідэнт, адлюстроўвае тэму палёту. Галоўны элемент інтэр'ера платформеннага ўчастка — квадратныя свяцільні на фоне алюмініевай падвеснай столі з люстраной паверхняй, якія нібыта лунаюць у паветры. Афармленне станцыі «Немаршанскі сад», як няцяжка здагадацца, сімвалізуе сабой сад. У дызайнераў атрымалася дабіцца адчування настрою знаходжання пад кронамі дрэў, стварыць эмацыянальную сувязь са знешняй прасторай. «Слуцкі гасцінец» — сучасная гістарычная станцыя. Канцэпцыя афармлення ўяўляе сабой набор гістарычных метафар, цытат ва ўльтрасучасных формах і колерах. Ёсць месца і для самай вядомай славутасці Слуцка — паясоў. Некаторыя ўзоры, якія выкарыстоўваюцца ў вырабах з тканіны, у стылізаваным выглядзе знайшлі свае адлюстраванне ў інтэр'еры станцыі.




### Задача ад Першага

> ***Няшмат гарадоў у свеце і тады, і цяпер займаецца будаўніцтвам метро. Калі мы спынім, не будзе гэтай вялікай школы. А гэта супастаўна з космасам, толькі пад зямлёй, гэта найвышэйшы ўзровень будаўніцтва, тут інавацыі, найноўшыя тэхналогіі, і адсюль будаўнікі там, наверсе, на зямлі, чэрпаюць сучасныя метады будаўніцтва.***

*Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна. 6 лістапада 2020 года.*

## «Праца чакае вялікая і няпростая»

Чатыры гады таму, адкрываючы першыя чатыры станцыі трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна, заўважыў, што гэты экалагічна чысты від транспарту стаў самым масавым і папулярным, увогуле народным. У 2024 годзе з адкрыццём новых трох станцый народны транспарт стаў яшчэ больш зручным для мінчан і гасцей сталіцы.

«Аэрадромная», «Немаршанскі сад», «Слуцкі Гасцінец» — тры станцыі, увод якіх у эксплуатацыю скончыў будаўніцтва першай чаргі трэцяй лініі метрапалітэна, што складаецца з сямі станцый і электрадэпо. «Жыхары найбліжэйшых раёнаў гэтага вельмі чакалі, бачылі, што будуюцца новыя станцыі метро. Я думаю, што значна палепшыцца лагістыка для жыхароў сталіцы. І мы разлічваем, што жыхары найбліжэйшых раёнаў штодзень будуць карыстацца новымі станцыямі. Яны сапраўды пабудаваны добра, якасна, для ўсіх катэгорый пасажыраў створаны камфортныя ўмовы», — адзначыў старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў.

На гэтым праца на спыняецца. Цяпер Зеленалужскую лінію метро будуць весці да плошчы Бангалор. Як адзначыў мэр Мінска, праца ўжо кіпіць: «Сеткі па вуліцы Максіма Багдановіча вынесены, знесена некалькі будынкаў, на месцы якіх размясцяцца станцыі. У лютым 2025 года мы плануем пачаць пракладку тунэляў, для гэтага ўжо ўсё гатова, і будаўніцтва станцый. Даўжыня новага ўчастка, будаўніцтва якога мы пачынаем, складзе звыш чатырох кіламетраў. Праца чакае вялікая, яна будзе няпростай. Трэба будзе прайсці пад Свіслачу. Работы будуць весціся ў густанаселенай частцы горада. Будзе няпроста, але я думаю, што мы справімся».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Афіцыйна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў чарговы ўказ аб памілаванні 20 асоб, якія ўчынілі злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці.**

З памілаваных 11 — жанчыны, 14 маюць хранічныя захворванні, у 10 асуджаных ёсць дзеці, адна жанчына мае чацвярых дзяцей.

Усе яны хадайнічалі аб памілаванні, раскаяліся ва ўчыненым.

Міністэрства ўнутраных спраў пракантралюе іх паводзіны пасля вызвалення.

* * *

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні народу Рэспублікі Карэя ў сувязі з крушэннем пасажырскага самалёта ў міжнародным аэрапорце Муан.**

«У Беларусі з вялікім болем і спагадай успрынялі навіны аб шматлікіх чалавечых ахвярах жудаснай трагедыі. У гэты цяжкі час накіроўваем свае словы падтрымкі і суцяшэння сем'ям загінулых, а таксама пажаданні хутчэйшага выздараўлення пацярпелым», — гаворыцца ў спачуванні.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

# СТРАТЭГІЯ НА ЗАЎТРА

## Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка: «Задача па росце эканомікі ў 2025 годзе складаная, але іншых мэт мы не ставім»

**Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заявіў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. Ён таксама патлумачыў паляпшэнне шэрагу прагнозаў работы беларускай эканомікі, за кошт чаго забяспечваецца рост экспарту і даходаў насельніцтва. Закрануў ён і тэму пашырэння праграмы «Адзін раён — адзін праект». Падрабязнасці — у матэрыяле.**

Каментуючы паляпшэнне шэрагу прагнозаў па рабоце беларускай эканомікі (напрыклад, МВФ і ЕАБР), Раман Галоўчанка адзначыў:

— Гэтыя прагнозы з'яўляюцца інструментам пэўных маніпуляцый, гэта значыць, зразумела, што, хто фінансуе або хто плаціць грошы, той гэту музыку і заказвае. Вядома, ва ўмовах такога ціску, які мы ўсе зведвалі, што яны маглі нам сказаць? Вядома, будзе дрэнна, будзеце загінацца і гэтак далей, наогул, у вас будзе інфляцыя, стагфляцыя, дэвальвацыя і іншае.

Паводле яго слоў, эканамічны блок краіны ацэньваў гэта адэкватна:

— Таму абсалютна па такой прычыне не перажывалі. Мы арыентуемся на ўласныя прагнозы, якія з'яўляюцца выверанымі. Тое, што яны цяпер пераацэньваюць у бок павышэння, — вымушаная мера. Ужо лічбы відаць, таму потым, уласна, заказчыкі спытаюць: а куды вы глядзелі? І гэта ж уплывае на іх рэпутацыю, калі яны не могуць адэкватна спрагназаваць нават такія паказчык, як тэмпы росту эканомікі, тое, у чым можна верыць. Таму тут нічога дзіўнага няма.

Гаворачы аб плане забяспечыць рост эканомікі ў 2025 годзе на 4,1 працэнта, Раман Галоўчанка адзначыў:

— Сапраўды, задача складаная, але мы не можам для сябе іншых мэт ставіць, таму што іншага выбару, акрамя такога дынамічнага развіцця, у нас няма.

Што датычыцца вынікаў 2024 года, Раман Галоўчанка паведаміў:

— Калі казаць пра 2024 год і нашы вынікі, то вельмі важна, што мы, напэўна, большасць з таго, што задумалі, выканалі, прычым спланавалі досыць выразна. І па ВУП, па многіх астатніх параметрах мы перавыканалі свае планы. Вельмі важна, што інфляцыя засталася ў тым калідоры, які мы для яе адвялі. Даходы насельніцтва выраслі істотна больш, чым мы планавалі, гэта значыць, мы планавалі тры з чымсьці працэнта, яшчэ пакуль афіцыйных лічбаў няма, але я думаю, што ў раёне 9-10 % мы атрымаем. Пры тым, што ўсё разам тут маецца на ўвазе: і пенсіі і гэтак далей. А рэальная заработная плата вырасце на 13 %. Мы так разлічваем, мяркуючы па папярэдніх даных.

Прэм'ер-міністр дадаў:

— Экспарт таксама ў нас у плюсе, у добрым плюсе. Гэты год таксама будзе для нас рэкордным, ужо цяпер па дзесяці месяцах мы бачым, што дадалі 2 млрд долараў у экспарце. Нядрэнная лічба, асабліва ва ўмовах усіх складанасцяў, якія мы адчуваем, і ціску, якому падвяргаемся, гэта салідная прыбаўка. Вядома ж, за кошт нарошчвання фізічных аб'ёмаў, за кошт дыверсіфікацыі экспарту.

Гаворачы аб планах на экспарт у 2025 годзе, кіраўнік урада сказаў коратка:

— Стаўлю задачу 5 % дадаць.

Адказваючы на пытанне, ці будзе ў 2025 годзе прадоўжана праграма «Адзін раён — адзін праект», Раман Галоўчанка адзначыў, што безумоўна:

— Рэалізавана ўжо амаль 40 праектаў з аб'ёмам інвестыцый каля 2 млрд рублёў. Мы зусім нядаўна абнавілі пералік гэтых праектаў, пашырылі крытэры для ўключэння ў гэтую праграму, дадалі развіццё сектара турызму. У спісе на сёння актуальнымі з'яўляюцца больш за 200, 208, калі быць дакладным, праектаў (гэта без уліку завершаных).

Ён выказаў думку, што, напэўна, праграма атрымае новую назву:

— «Рэгіянальная ініцыятыва» — яна будзе называцца, што больш адпавядае яе духу. Таму што «Адзін раён — адзін праект» стала неактуальна: у многіх раёнах ужо больш за два праекты, а ў некаторых ёсць і па чатыры.

Прэм'ер-міністр таксама паведаміў аб планах на ўзвядзенне жылля:

— Плануем пабудаваць каля 4 млн 400 тысяч квадратных метраў жылля. Каб было больш зразумела, гэта каля 45 тысяч кватэр і дамоў. У тым ліку з іх каля 1 млн — жыллё з дзяржаўнай падтрымкай, якое будуецца ў адпаведнасці з ільготнымі крэдытамі. Калі паглядзець, чаго мы дамагліся ў забеспячэнні людзей жыллём за час нашай незалежнасці, то мы дадалі парадку 10 метраў на чалавека, — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

**Паводле БелТА.**

# БЮДЖЭТ-2025: ШТО Ў ДАХОДАХ І РАСХОДАХ?

## Прыярытэтнымі кірункамі бюджэтнай палітыкі ў надыходзячым годзе застануцца сацыяльная сфера і павышэнне дабрабыту грамадзян

**Не так даўно Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год». А гэта значыць, што з 1 студзеня Беларусь будзе жыць ужо ў адпаведнасці з новым галоўным фінансавым дакументам краіны. Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ расказаў «Звяздзе» аб даходнай і расходнай частцы бюджэту.**



У прыватнасці, парламентарый акцэнтаваў увагу на тым, што пры фарміраванні праекта бюджэта на 2025 год за аснову прыняты сцэнарый умоў эканамічнага развіцця, зацверджаны Указам Прэзідэнта «Аб важнейшых паказчыках і параметрах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2025 год», які прадугледжвае ў наступным годзе рост ВУП на ўзроўні 104,1 %, узровень інфляцыі не больш чым 5 %.

Такім чынам, даходы рэспубліканскага бюджэту ў 2025-м плануюцца ў памеры 45,8 млрд рублёў, што на 8,1 % больш, чым ацэнка паступленняў у бягучым годзе.

Дарэчы, даходы кансалідаванага бюджэту таксама падрастуць у параўнанні з чаканым выкананнем за 2024-ы — на 9,9 % і складуць 78,7 млрд рублёў.

### ЗА КОШТ ЧАГО ПЛАНУЕЦЦА РОСТ ДАХОДНАЙ ЧАСТКІ?

— Павелічэнне паступленняў у бюджэт абумоўлена як ростам эканомікі, які прагназуецца, так і сацыяльнымі мерамі ў рамках бюджэтнай кансалідацыі, у тым ліку індэксацыяй падатковых ставак, устаноўленых у абсалютных велічынях, на прагназаваны індэкс росту спажывецкіх цэн, павелічэннем ставак акцызаў з улікам міжнародных абавязацельстваў, пашырэннем падатковых баз шляхам павышэння якасці падатковага адміністравання, адменай малаэфектыўных падатковых ільгот, — растлумачыў суразмоўца.

Для больш дэталёвага разумення варта ў долевых суадносінах ацаніць структуру даходнай часткі рэспубліканскага бюджэту. Так, у складзе даходаў рэспубліканскага бюджэту падатковыя паступленні займаюць 75,4 % агульнай сумы даходаў, непадатковыя — 10 %, бязвыплатныя паступленні — 14,6 %. У 2025 годзе найбольшую ўдзельную вагу ў структуры даходаў рэспубліканскага бюджэту складуць ПДВ (41,6 %), даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці (17,5 %), акцызы (6,6 %), падатак на прыбытак (6 %).

Што датычыцца расходнай часткі бюджэту, старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі нагадаў, што ў 2025-м яна плануецца ў суме 50,3 млрд рублёў з ростам 12 % да ацэнкі 2024-га.

Дарэчы, расходы кансалідаванага бюджэту таксама запланаваны з ростам — яны павінны пакінуць 83,9 млрд рублёў і павялічыцца на 13,9 % у адносінах да чаканага выканання 2024-га.

Варта сказаць, што ў 2025 годзе чакаецца перавышэнне расходаў над даходамі, г. зн. бюджэт мяркуецца дэфіцытным у памеры 4,45 млрд рублёў, які плануецца прафінансаваць за кошт рэштак сродкаў рэспубліканскага бюджэту, знешніх і ўнутраных запазычанняў.

У сувязі з гэтым Уладзіслаў Татарыновіч акцэнтуе ўвагу на тым, што бюджэт пралічаны на рэалістычнай аснове.

**Суразмоўца падкрэсліў: структура расходаў 2025 года істотных змяненняў не зведала і застаецца сацыяльна арыентаванай:**

— Прыярытэтнымі кірункамі бюджэтнай палітыкі ў 2025 годзе застаюцца сацыяльная сфера, павышэнне дабрабыту грамадзян за кошт павелічэння памеру заработнай платы і бюджэтных субсідый, забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, падтрымка рэальнага сектара эканомікі ва ўмовах, якія складваюцца.

Сенатар канстатаваў: мэтавай задачай выступае давядзенне суадносін заробкаў бюджэтнікаў у параўнанні з сярэднерэспубліканскім узроўнем у наступных параметрах: настаўнікаў — 100 %, урачоў — 150 %, работнікаў сферы сацабслугоўвання — 69,9 %, культуры — 64,7 %, фізкультуры і спорту — 87,1 %. Дасягненне гэтых паказчыкаў запланавана за кошт павышэння памеру базавай стаўкі (з 1 студзеня яна вырасце да 271 рубля) і выплаты надбавак па галінах.

### Дарэчы

У ходзе нядаўняй справаздачы ўрада на сумесным пасяджэнні Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў запэўніў парламентарыяў, што амаль усе сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы, узятыя ў пяцігадовай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, якая завяршаецца ў наступным годзе, будуць выкананы. У прыватнасці, сярэдняя заработная плата па краіне ў 2025 годзе складзе 2416 рублёў, у бюджэтным сектары — 2005 рублёў (гэта 83 % да рэспубліканскага ўзроўню). Будзе забяспечана заданне па суадносінах зарплат да сярэднерэспубліканскага ўзроўню: урачоў — 1,5 раза, настаўнікаў — 106 %.

У цэлым на гэтыя мэты прадугледжаны выдаткі ў памеры 20,4 млрд рублёў.

Таксама, што датычыцца сацыяльнага блока расходнай часткі бюджэту, на выплату "сямейнага капіталу" прадугледжаны сродкі ў памеры 361,1 млн рублёў, а на фінансаванне будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай — 1,7 млрд рублёў.

У завяршэнне Уладзіслаў Татарыновіч акцэнтаваў увагу на тым, што расходная частка кансалідаванага бюджэту на фінансаванне сацыяльнай сферы вызначана ў памеры 35,5 млрд рублёў, з якіх 13,1 млрд рублёў прадугледжаны на ахову здароўя (з ростам на 12,2 % да 2024-га) і 13,8 млрд — на адукацыю (плюс 14,5 % да бягучага года).

— Закон «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год» быў прыняты да наступлення новага года, што дае магчымасць на мясцовым узроўні зацвердзіць мясцовыя бюджэты і пачаць далейшую іх рэалізацыю, — рэзюмаваў суразмоўца.

# ЗАКАНАМЕРНЫ ВЫНІК

## Выраслі ВУП і заробкі, з'явіліся новыя вытворчасці: як спрацавала беларуская эканоміка ў 2024-м

**Геапалітычная турбулентнасць у рэгіёне і бесперапынны знешні ціск. З гэтым Беларусі даводзілася жыць увесь 2024 год. Многія заакіянскія эксперты прадказвалі крах беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, якую мы выбудоўвалі дзесяцігоддзямі. Ні пра які рост і гаворкі не ішло. Але супраць фактаў, як гаворыцца, нічога не зробіш. І сёння тыя ж так званыя аналітыкі вымушаны канстатаваць: беларуская эканоміка паспяхова развіваецца, і ёсць усе перадумовы для далейшага росту. У чым жа сакрэт поспеху — у нашым матэрыяле.**

### ДАСЯГНУЦЬ ПАСТАЎЛЕНЫХ ЗАДАЧ

Традыцыйна ў кастрычніку кіраўнік краіны падпісвае ўказы, якімі зацвярджаюцца асноўныя прагнозныя параметры развіцця на год. Летась Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу, каб рост ВУП па выніках года склаў 3,8 працэнта, а даходы насельніцтва прыраслі на 3,5 працэнта. Пры гэтым інфляцыя не павінна перавысіць 6 працэнтаў. Некаторыя эксперты казалі, што для эканамічнага блока краіны гэта «задачы з зорачкамі». Спасылаліся на знешні фактар. Аднак, нягледзячы на ўсе складанасці, беларуская эканоміка паказала не толькі ўстойлівасць да шокаў, але і ўпэўнены рост.

— Калі падводзіць папярэднія вынікі работы эканомікі ў 2024 годзе, неабходна адзначыць, што сістэмная работа, якая праводзіцца ўрадам па забеспячэнні ўстойлівасці эканомікі і росту дабрабыту насельніцтва, дае свае вынікі, — адзначыў **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР.** — Валавы ўнутраны прадукт за 11 месяцаў вырас на 3,9 працэнта, што вышэй за прагнозны паказчык. Драйверамі росту выступаюць прамысловасць, гандаль, будаўнічая сфера, транспарт і сельская гаспадарка.

Лакаматывам эканомікі па-ранейшаму застаецца прамысловасць з тэмпам росту 105,5 працэнта. Прычым прырастаем за кошт не толькі традыцыйных тавараў, але і высокатэхналагічнай, інавацыйнай прадукцыі, на якую зроблена стаўка ў гэтай пяцігодцы. Рост выпуску стымулюецца высокім попытам на айчынныя тавары.

— Сёння нашы намаганні накіраваны на развіццё канкурэнтнага бізнес-асяроддзя, паляпшэнне структуры інвестыцый. Прадпрыемствы актыўна ўкладваюць у абнаўленне і пашырэнне вытворчых магутнасцяў. Як вынік — інвестыцыі ў асноўны капітал растуць тэмпамі, вышэйшымі за прагнозныя. У студзені — лістападзе яны прыраслі на 107,2 працэнта, а ўдзельная вага затрат на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў у агульным аб'ёме інвестыцый дасягнула 40 працэнтаў, — удакладніў міністр эканомікі.

Эфектыўная работа галін стала падмуркам для росту рэальных даходаў насельніцтва. Ён склаў 109,5 працэнта, што значна вышэй за прагноз (103,5 працэнта). У 2024-м двойчы павышалася базавая стаўка, да якой прывязаны стымулюючыя і кампенсацыйныя выплаты бюджэтнікам. А для павелічэння даходаў нізкааплатных катэгорый работнікаў арганізацый рэальнага сектара з 1 студзеня на 13 працэнтаў вырас мінімальны заробак. Двойчы сёлета павышаліся і пенсіі. У выніку ў студзені — лістападзе 2024 года рэальны рост пенсій па ўзросце склаў 109,6 працэнта.

— Такім чынам, сёння ў эканоміцы пераважаюць станоўчыя тэндэнцыі, фарміруюцца ўмовы для далейшага якаснага росту, — упэўнены Юрый Чабатар.

### ЦЭНЫ ПАД КАНТРОЛЕМ

Многія ўжо звярнулі ўвагу, што прадуктовы чэк у магазіне за апошні час не пацяжэў. І ў краіне невысокая інфляцыя. Згодна з данымі статыстыкі, гэты паказчык у лістападзе склаў 5,5 працэнта, што ніжэй за мэтавы параметр. Гэта пазітыўна адбіваецца і на дынаміцы ўнутранага попыту: рознічны тавараабарот за 11 месяцаў вырас амаль на 12 працэнтаў. Усё гэта — вынік сістэмы рэгулявання цэн, якая па даручэнні Прэзідэнта дзейнічае ў Беларусі. Эксперты ўпэўнены, што дзякуючы своечасовым мерам удалося спыніць рост цэн, які набіраў абароты. Нагадаем: Аляксандр Лукашэнка ў кастрычніку 2022 года па выніках нарады аб цэнавай сітуацыі ў краіне падпісаў Дырэктыву № 10 «Аб недапушчальнасці росту цэн». Потым пастановай урада нумар 713 было ўведзена рэгуляванне цэн на тавары спажывецкага кошыка.

Спажывец ад рэгулявання тольскі выйграў. Тавару на паліцах магазінаў дастаткова, і, што важна, ён даступны на любы кашалёк. Гэта пацвярджаюць вынікі рэгулярных маніторынгаў, якія праводзяць дзяржаўныя органы.



— Дзяржаўнае рэгуляванне цэн уводзілася як мера ў адказ на знешнія шокі, — адзначыў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ.** — Яно не дазваляе вытворцу або прадаўцу спасылацца на ўплыў знешніх фактараў і перакладваць любыя свае выдаткі або жаданне атрымаць звышпрыбытак на пакупніка. Але пры гэтым дае яму магчымасць зарабляць. У гэтым прынцып справядлівасці ў цэнаўтварэнні, да захавання якога імкнёмся. Сёння мы бачым, што пастанова ўрада нумар 713 дасягнула мэты, якую паставіў Прэзідэнт, — забяспечыць стабільнасць цэнавай сітуацыі.

У сваю чаргу **вядомы вучоны-эканаміст Міхаіл КАВАЛЁЎ** упэўнены, што, з пункту гледжання спажыўца, увядзенне дастаткова жорсткіх абмежаванняў па гандлёвых нацэнках апраўдала сябе.

— У цэлым трэба сказаць, што ў розных краінах свету па-рознаму спрабуюць рэгуляваць цэны, — гаворыць эксперт. — Зразумела, на першае месца выходзіць стварэнне жорсткіх умоў канкурэнцыі. Напрыклад, рэгулятары спрабуюць не дапусціць манапольных сетак, а дамагаюцца, каб была канкурэнцыя за пакупнікоў. Па-другое, у большасці краін свету спрабуюць па-справядліваму падзяліць канчатковы кошт тавару паміж гандлёвай сеткай і вытворцам. Дзеянні Прэзідэнта па рэгуляванні цэн накіраваны супраць не зусім сумленных бізнесменаў. Крытыкам рашэння дзяржавы я б нагадаў, што нават у Старажытным Рыме быў вельмі жорсткі кантроль за цэнамі. Ужо ў тыя часы ўлады разумелі, што рынак рынкам, а кантраляваць яго трэба.

### ЯКАСЦЬ ВА ЎСІМ

**2024-ы, як вядома, кіраўніком дзяржавы быў абвешчаны Годам якасці. З моманту свайго самастойнага развіцця наша краіна вызначыла гэты паказчык як самую важную задачу дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Брэнд «Зроблена ў Беларусі» даўно вядомы за мяжой, і спажывец выбірае нашу прадукцыю менавіта за якасць.**

— Абвяшчэнне 2024 года Годам якасці надало новы імпульс развіццю беларускай якасці, павышэнню яе пазнавальнасці і даверу як у краіне, так і на замежных рынках. У Беларусі традыцыі якасці маюць сістэмную дзяржаўную падтрымку, — адзначыла **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Алена МАРГУНОВА.**

Дарэчы, у 2024 годзе зацверджана больш за 660 дзяржаўных стандартаў. У краіне налічваецца 67 нацыянальных эталонаў адзінак велічынь.

— Для павышэння якасці прадукцыі адказныя органы і арганізацыі распрацавалі і ўстанавілі мэтавыя паказчыкі і індыкатары. Найважнейшую ролю ў забеспячэнні стабільнай якасці прадукцыі адыгрывае ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы галін і арганізацый. Для гэтага абнаўляецца выпрабавальнае абсталяванне і сродкі вымярэння, прымяняецца статыстычная ацэнка стабільнасці тэхналагічных працэсаў, сучасныя інструменты сістэмнага менеджменту, — дадала кіраўнік Дзяржстандарта. — Ключавымі кірункамі на наступны год стануць апераджальны рост прамысловага патэнцыялу, развіццё інфраструктуры якасці, уключэнне новых сістэм кіравання беражлівай вытворчасцю, павышэнне кампетэнтнасці спецыялістаў. Таксама будуць сфарміраваны стратэгічныя мэты канкурэнтаздольнасці з выкарыстаннем інавацыйнага патэнцыялу, рызыка-арыентаваных падыходаў.

### КААПЕРАЦЫЙНЫ ПАДЫХОД

Нелегітымны знешні націск з боку так званага калектыўнага Захаду, з якім сутыкнуліся Беларусь і Расія, актывізаваў паглыбленую кааперацыю ў розных галінах, у першую чаргу ў прамысловасці. Актыўна наладжваюцца вытворчыя ланцужкі ў машынабудаванні, мікраэлектроніцы і цяжкай прамысловасці. Такое ўзаемадзеянне ў існуючых умовах — жыццёва важнае пытанне, у тым ліку тэхналагічнай бяспекі. У межах Саюзнай дзяржавы нашы краіны падпісалі шэраг важных пагадненняў па супрацоўніцтве ў ключавых галінах. І сёння больш за 8 тысяч беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў звязаны вытворчай кааперацыяй, яны ажыццяўляюць узаемныя пастаўкі сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых вырабаў.

— Прамысловасць — гэта залог паспяховага развіцця. Усё, што нас атачае, і ўсё, чым мы карыстаемся, — гэта вынік работы прамысловасці. Інтэграцыя з Расіяй прыносіць свой плён. Беларуская тэхналагічная база і расійскія вытворчыя і прыродныя рэсурсы — магутны тандэм для асваення новых відаў прадукцыі і ўмовы поўнай эканамічнай незалежнасці, — упэўнены **доктар эканамічных навук Валерый БАЙНЕЎ.** — Імпартазамяшчэнне — адзін з асноўных кірункаў развіцця беларускай і расійскай эканомік. Асабліва ва ўмовах уведзенага тэхналагічнага эмбарга з боку Захаду. Яны спрабуюць нас задушыць тэхналагічна. І гэтыя спробы з-за акіяна робяцца ўжо на працягу апошніх некалькіх гадоў. Галоўная задача — знішчыць эканоміку Саюзнай дзяржавы. Таму імпартазамяшчэнне — ключавое пытанне. Яно дае магчымасць забяспечыць тэхналагічны, фінансавы і харчовы суверэнітэт і бяспеку нашых краін. З Расіяй у нас гістарычна склаліся добрыя і трывалыя сувязі. Мы брацкія народы. Таму любыя сумесныя праекты ў нас рэалізоўваюцца паспяхова.

### ДАДАЦЬ ЗАРАД ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

Сёлета ў Беларусі назіраўся сапраўдны бум на электрамабілі. Іх колькасць павялічылася амаль удвая. Калі летась іх было не больш за 10 тысяч, то сёння ўжо больш за 21 тысячу. Пакуль што на дарогах краіны зялёныя аўтамабільныя нумары можна ўбачыць на машынах замежнай вытворчасці. Але неўзабаве ў аматараў руху ў «стылі электра» з'явіцца магчымасць перасесці на айчынны электрамабіль. Ужо сабраны першыя перадсерыйныя ўзоры айчыннага электрамабіля. Яго стварэнне — даручэнне Прэзідэнта. У якасці базы выбраны самы папулярны аўтамабіль у беларусаў — кросовер BelGee X50. Спачатку будзе зроблена пяць машын. На гэтай партыі спецыялісты праверацъ эфектыўнасць, эканамічную мэтазгоднасць і адпрацуюць тэхналагічныя рашэнні.

Па словах **генеральнага дырэктара СЗАТ «БЕЛДЖЫ» Генадзя СВІДЗЕРСКАГА,** у вытворчасці ўзялі ўдзел беларускія і расійскія вытворцы.

— Ідэя стварэння беларускага электрамабіля з'явілася пасля пакупкі ліцэнзіі, якая дала доступ да пэўнай дакументацыі. Платформа вырабляецца на канвееры серыйнага завода «БЕЛДЖЫ» па дакументацыі электрамабіля, распрацаванага ў Акадэміі навук. Пасля атрымання прамысловых узораў можна будзе гаварыць аб камерцыйных і тэхнічных перспектывах развіцця гэтага кірунку. Адно зразумела ўжо цяпер: гэта важны крок у авалоданні кампетэнцыямі ў распрацоўцы і пастаноўцы на вытворчасць легкавых аўтамабіляў.

### ЗАДАННЕ НА ЗАЎТРА

Многіх цікавіць: а як жа будзе развівацца беларуская эканоміка ў новым 2025 годзе? Адказ можна знайсці ва ўказах Прэзідэнта нумар 384 і нумар 385, якімі зацверджаны найважнейшыя прагнозныя параметры развіцця краіны і мэтавыя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі на 2025 год. Дакументы захоўваюць накіраванасць эканамічнай палітыкі на забеспячэнне ўстойлівасці эканомікі і рост дабрабыту насельніцтва. Так, рост валавога ўнутранага прадукту прагназуецца да 104,1 працэнта за кошт трох праграм: вытворчай, экспартнай і інвестыцыйнай. Указам таксама ўстанаўліваюцца мэтавыя арыенціры для іх выканання. Чакаецца, што экспарт тавараў і паслуг павялічыцца на 5,4 працэнта. Ключавым фактарам росту стане нарошчванне фізічных аб'ёмаў. У эканоміку плануецца накіраваць на 7,8 працэнта больш інвестыцый, чым у 2024-м. Паспяховая рэалізацыя вытворча-інвестыцыйных планаў дасць магчымасць забяспечыць рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва. Захаваецца палітыка па стрымліванні цэн. Для гэтага для Нацыянальнага банка і ўрада ўстанаўліваецца мэтавая задача па абмежаванні інфляцыі на ўзроўні, які не перавышае 5 працэнтаў.

**Валянцін ПАЎЛОВІЧ.**

# МЕСЦА

## Чаму варта наведаць




**Унікальная выстаўка «Мая Беларусь» адчыніла дзверы для наведвальнікаў у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. Экспазіцыя адлюстроўвае дасягненні незалежнай Беларусі ў розных сферах дзейнасці: касмічнай, навуковай, спартыўнай, харчовай і іншых.**

На плошчы звыш 30 тыс. м$^2$ размешчаны экспазіцыі, фуд-корт, зона культурных мерапрыемстваў, а таксама розныя лакацыі «Мая Беларусь — месца сілы», дзе прадстаўлены дасягненні ў культуры і адукацыі, экалогіі і сельскай гаспадарцы і іншых сферах дзейнасці.

— Мы можам з гонарам сказаць, што краіна адбылася як сацыяльна арыентаваная дзяржава і Беларусь інтэлектуальная. Галоўнае багацце, якое ў нас ёсць, — нашы людзі. Усё, што зроблена ў краіне, — зроблена дзякуючы працы і інтэлекту нашых людзей. У рамках выстаўкі мы бачым розныя тэматычныя блокі, якія падкрэсліваюць не толькі гісторыю станаўлення краіны, але і перспектыву будучыні, — адзначыў **міністр адукацыі Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ.**

Ён паведаміў, што ў краіне актыўна развіваюцца і навукаёмістыя галіны эканомікі, напрыклад, атамная энергетыка, пачалі рыхтаваць новых спецыялістаў у галіне хімічных, ядзерных і інфармацыйных тэхналогій, матэрыялазнаўства. Да таго ж з'явілася інфраструктура — біятэхналогіі.

— Стварэнне Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі непарыўна звязана не толькі з развіццём аграпрамысловага комплексу — у многім гэта вядомы брэнд на знешнім рынку за межамі нашай краіны, — падкрэсліў Андрэй Іванец.

Развіццё атрымалі і такія традыцыйныя галіны, як машынабудаванне, бо стварэнне электробусаў, гібрыдаў, электрасамазвалаў, якія, паводле слоў кіраўніка Міністэрства адукацыі, «ужо старонка гісторыі суверэннай Беларусі, якая непарыўна звязана з тэхналогіямі і інтэлектам». Дарэчы, з сучасным электратранспартам і найноўшы-









Спецыяльны рэпартаж

# ГОЛАС «МАРАФОНУ»

## Гучанне акцыі дапоўніла





**Аб'екты-падарункі, выступленні спікераў, «медыяланчы» са знакамітасцямі і прэм'еры ад артыстаў... «Марафон адзінства» ў Мазыры напярэдадні Новага года спалучыў атмасферу свята, незабыўныя сустрэчы і каштоўныя падарункі.**

### СВОЙ «КАЛІЗЕЙ»!

Мурал «Будучыня Беларусі ў тваіх руках» упрыгожыў сцяну жылога дома па вуліцы Рыжкова. Гэты ж адрас трапіў ва ўсе паблікі як месца новага грандыёзнага мультыпрофільнага аб'екта — фізкультурна-аздараўленчага цэнтра «Палессе-Арэна». З адкрыццём знакавага аб'екта міжнароднага ўзроўню жыхароў Гомельшчыны павіншаваў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ.**

— Дазвольце шчыра павіншаваць вас з ужо паўнацэнным адкрыццём цэнтра «Палессе-Арэна», які адразу стаў адным з найлепшых у Беларусі спартыўна-масавых аб'ектаў. Вось маладыя людзі тут у фае мне сказалі: «Нарэшце ў Беларусі з'явіўся свой Калізей!» Напэўна, гэта праўда, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта і дадаў, што адкрыццё «Палессе-Арэны» — таксама прыклад адзінства беларусаў.

Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што Мазырскі раён у апошнія гады штогод асвойвае паўмільярда рублёў інвестыцый, і гэта абсалютна топавы ўзровень у маштабах усёй краіны.

— Акрамя моцнай прамысловасці, мазыране занялі лідзіруючыя пазіцыі ў аграрным сектары: па малаку, свінагадоўлі, мясапрапрацоўцы. Таму трэба актыўна працягваць і давесці да канца ўсе намечаныя праекты. Бо, як гаворыць часта наш Прэзідэнт, умацуем эканоміку — у разы лягчэй будзе гарантаваць бяспеку і суверэнітэт, — звярнуў увагу Дзмітрый Крутой.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта нагадаў, што адна з задач, якую паставіў перад «Марафонам адзінства» лідар краіны Аляксандр Лукашэнка, — шукаць, раскрываць і даваць пуцёўку ў вялікае творчае жыццё талентам і калектывам з рэгіёнаў.

Да віншавання далучыўся **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** Ён заўважыў, што аналагаў новаму аб'екту ў рэгіёне няма. Адкрыццё дазволіць «Палессе-Арэне» праводзіць не толькі спаборніцтвы міжнароднага ўзроўню, але і маштабныя грамадска-культурныя мерапрыемствы.

— У наступным годзе плануем пабудаваць басейн у Хойніках і пяць стадыёнаў у Акцябрскім, Лоеве, Ельску, Буда-Кашалёве і аграгарадку Капаткевічы, — падзяліўся планамі Іван Крупко.

### СІЛА МАСТАЦТВА

Упершыню ў праграме мерапрыемстваў «Марафону адзінства» менавіта ў Мазыры асобную лакацыю прысвяцілі дзейнасці Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Самыя яркія касцюмы, фотахроніку, афішы спектакляў падрыхтавала выстава «Вялікі тэатр Беларусі: Гісторыя. Ідэі. Здзяйсненні». Падарункам для аматараў танцаў, музыкі, класічнай і сучаснай харэаграфіі сталі майстар-класы артыстаў. На канцэрце «Час выбраў нас» артысты Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі прадставілі балетную версію народнай кінастужкі — «Іроніі лёсу, ці З лёгкай парай».

— Хачу падзякаваць нашаму Прэзідэнту за ідэю правядзення «Марафону адзінства». Рада, што мы з Мінска выязджаем у розныя гарады, што можам прывезці наша мастацтва ў кожны куток Беларусі, — падзялілася **прыма-балерына Вялікага тэатра оперы і балета, народная артыстка Беларусі Ірына ЯРОМКІНА.**

### СКЛАДАНЫ, КРУТЫ, РЭЗУЛЬТАТЫЎНЫ...

Шлях, які прайшла наша краіна за апошнія дзесяцігоддзі, прайсці зноў разам запрасілі жыхароў і гасцей Мазыршчыны выставачны праект БелТА «Беларусь. Узлёт». На сарака фотапараўнаннях — рэаліі беларусаў на пачатку 90-х гадоў і кадры сучаснага жыцця.

— Мы назвалі гэтую выставу «Беларусь. Узлёт», бо лічым, што наша краіна за 30 гадоў прайшла складаны, круты, надзвычайны, рэзультатыўны шлях. Таму не рух, а менавіта ўзлёт. Вельмі шмат мяняецца ў нашым жыцці. І вялікі дзякуй хочацца сказаць нашаму старэйшаму пакаленню, нашым бацькам, бабулям, дзядулям. Цяжка ўявіць, як яны пасля развалу Савецкага Саюза, у пачатку 90-х, падымалі нас, дзяцей, думалі, як нас вучыць, як жыць далей. І задача нашага пакалення — разумець кошт усяго гэтага. Бо згубіць вельмі лёгка. А «Марафон адзінства» яднае розныя пакаленні, — падкрэсліла **генеральны дырэктар БелТА Ірына АКУЛОВІЧ.**

Выстава — гэта вялікі інтэрнэт-праект. Ён «жыве», а папоўніць яго можа любы ахвотны.

### РЭЦЭПТ САПРАЎДНАГА БЕЛАРУСА

Чакала жыхароў і гасцей Мазыра і традыцыйная для марафону «Знакавая сустрэча». Яе гасцямі сталі **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня праўлення Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН, футбаліст Аляксандр ГЛЕБ, генеральны дырэктар ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Аляксандр АСЕНКА і галоўны рэдактар «Альфа Радыё» Вадзім ШЭПЕТ.**

— Гэты фармат вельмі цікавы. Прываблівае сустрэча ў незвычайнай лакацыі: не ў зале ці ў аўдыторыі,

# НАШАЙ СІЛЫ

## выстаўку «Мая Беларусь»





мі тэхналогіямі, такімі як разумная кватэра, экасістэма «Разумны горад», можна азнаёміцца ў аднайменным тэматычным кластары. Прычым на многіх лакацыях усё прапаноўваецца не толькі пакратаць рукамі, але і паспрабаваць на справе на адмысловым трэнажоры кіраваць камбайнам, напрыклад.

Апрача «Разумнага горада», у рамках выставы прадстаўлены лакацыі «Мы — будучыня», «Прыгожая краіна», «Навука і інтэлект», «Клопат і здароўе», «Спартыўная краіна», «На варце», «Атамная энергія», «Сельская гаспадарка».

Цікавая экспазіцыя прадстаўлена і ў лакацыі Мінпрыроды. Тут можна атрымаць уяўленне аб найбольш перспектыўных вектарах развіцця краіны ў экалогіі і ўстойлівым прыродакарыстанні, сучасных дасягненнях у гэтым кірунку. Напрыклад, можна ўбачыць розныя віды карысных выкапняў нашай краіны (калійная і каменная соль, нафта, торф, пясок, сапрапель і інш.), даведацца аб іх ролі ў будаўнічай і эканамічнай сферы развіцця Беларусі. Прадстаўлены таксама макет буравой устаноўкі для здабычы нафты.

Багаццям нетраў нашай зямлі прысвечана і экспазіцыя Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Прычым не ўвогуле — напрыклад, можна ўбачыць дробна расфасаваны... торф.

— Найбольш актуальныя сёння для спажыўца не вялікія брыкеты торфа, а менавіта такая фасоўка, — тлумачыць дырэктар інстытута Дзмітрый Грумо.

Вялікая ўвага на выстаўцы ўдзелена і культурнай сферы нашай краіны, яе гістарычнай спадчыне: жывапісу, музыцы, рамёствам. Штодзень на працягу сямі тыдняў тут будуць праходзіць сустрэчы, прэзентацыі, прагляды фільмаў, мультфільмаў і гэтак далей.

— Кожная вобласць прадставіла тыя рамёствы, якія яе вылучаюць. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці — выраб валёнкаў, у Гродзенскай — саломапляценне і выцінанка, у Гомельскай — ткацтва. Выстаўка «Мая Беларусь» стала сапраўды ўнікальным мерапрыемствам, бо комплексаў з такім тэхналагічным забеспячэннем у нас яшчэ не было, — з гонарам адзначае **міністр культуры Руслан ЧАРНЕЦКІ.**

Выкарыстанне сучасных тэхналогій, яркія дэкарацыі і экспанаты, гульнявыя зоны і інтэрактыўныя элементы робяць выстаўку даступнай і цікавай для любога ўзросту.

**Марыя САМАЛЬ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## «Мая Беларусь» — сапраўднае адкрыццё

**Ужо ў першыя дні работы выстаўкі тут было даволі шмат наведвальнікаў. Мы пацікавіліся іх уражаннямі.**

— Я даволі часта наведваю такія мерапрыемствы. Мне падабаецца хадзіць па шматлікіх пляцоўках, разглядаць экспанаты, удзельнічаць у інтэрактывах, якія прапаноўваюць тыя ці іншыя кампаніі. Таму мне ёсць з чым параўноўваць. Дык вось «Мая Беларусь» — сапраўднае адкрыццё. Атрымалася не толькі цікава правесці час, але і даведацца шмат новага аб розных сферах дзейнасці нашай краіны, яе поспехах і дасягненнях. Я нават не задумвалася, колькі ўсяго новага і незвычайнага ствараецца ў Беларусі. Штучны інтэлект, інавацыйныя тэхналогіі лёгкай і цяжкай прамысловасці, дроны і робаты, разнастайныя аб'екты культуры, гісторыі... Бясконцыя залы з найцікавейшымі экспанатамі! Вочы разбягаюцца! І гэта ўсё створана нашым народам! — падзялілася ўражаннямі Марыя Карповіч.

— Выстава вельмі крутая! Такія класныя фотазоны, усялякія спартыўныя трэнажоры, дапоўненая і віртуальная рэальнасці. Мне больш за ўсё спадабаўся стол Пірагова — спецыяльны медыцынскі трэнажор для вывучэння ўнутранай будовы чалавека. Калі стану дарослай, абавязкова вывучуся на ўрача і таксама буду з яго дапамогай лячыць людзей! — падзялілася ўражаннямі Святлана Кузьмічова, якая прыйшла на выстаўку з бабуляй. Надзея Мікалаеўна найбольш уразілася інтэрактывам з водарамі і гукамі:

— Падыходзіш да лакацыі «Водары Беларусі» — і ўдыхаеш водар сенакосу ці роснага ранку. А ў лакацыі «Гукі Беларусі» можна паслухаць, як спяваюць нашы птушкі ці як рыпіць пад нагамі на марозе снег... Нібы ў дзяцінства вяртаешся, у родную вёску...

— Ніколі так востра не адчуваў гонар за сваю Радзіму, за яе інтэлектуальную і тэхнічную магутнасць, як сёння на выстаўцы. У кожнай зале — сведчанні паспяховага развіцця нашай краіны, беларускага шляху станаўлення. А як яскрава і ўдала ўсё прадстаўлена: прасторныя пляцоўкі для інтэрактыву, вялізныя экраны і праектары, амаль усё можна ўзяць у рукі, паспрабаваць, як той ці іншы экспанат працуе, даведацца аб яго прызначэнні. На некаторых пляцоўках нават былі акуляры віртуальнай рэальнасці, што дапамагалі завочна пабываць на той ці іншай лакацыі, — дадаў Павел Пятроўскі.

# З БЕРАГОЎ ПРЫПЯЦІ

## тэматыка Новага года









а ў гандлёвым цэнтры, калі людзі прыйшлі па пакупкі і могуць трапіць на «Знакавую сустрэчу», — падзяліўся Аляксандр Асенка.

На сустрэчы спікерам прапанавалі ацаніць у сферах, якія яны прадстаўляюць, дасягненні Беларусі за апошнія дзесяцігоддзі і ў 2024 годзе.

— За апошнія дзесяць гадоў вельмі шмат зроблена. Пабудавана вялікая колькасць спартыўных комплексаў. Для моладзі ёсць усё, каб развівацца, каб дабівацца поспеху, — зазначыў Аляксандр Глеб.

Знакамітаму беларускаму футбалісту паступіла шмат пытанняў ад гасцей сустрэчы. Цікавіў яго прафесійны шлях.

— Пачынаў займацца футболам на асфальце... Умоў не было, але жылі ідэяй, марай, мэту ставілі перад сабой, у дварах гулялі і былі шчаслівымі... Па-добраму зайздрошчу сённяшняй моладзі. Тыя ўмовы, якія створаны, — сапраўды, чаго яшчэ можна



жадаць, — падзяліўся Аляксандр Глеб.

Закранулі і тэму развіцця журналістыкі. Як падкрэсліў дырэктар ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Аляксандр Асенка, дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта за апошнія тры-чатыры гады нашы нацыянальныя сродкі масавай інфармацыі вельмі моцна рванулі ў вытворчасці ўласнага кантэнту.

Развівацца, рухацца наперад і пры гэтым вельмі хутка — такі пасыл для кожнага беларуса акрэсліў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін.

— Не толькі каб мы за спіной нашага «Бацькі» стаялі, якога ведаюць ва ўсіх краінах свету. Але каб самі рухалі сваю краіну, — заклікаў спікер. — Наш Прэзідэнт — гэта адлюстраванне нашага нацыянальнага характару. У беларуса ніколі словы са справай не разыходзяцца. Беларус, можа, часам і прамаўчыць, але зробіць... Вось гэтая наша сціпласць, часам нават залішняя, але затое сумленнасць, адкрытасць, дзелавітасць і прыцягвае да нас людзей, — расказаў «рэцэпт сапраўднага беларуса» Вадзім Гігін.

### ЦІКАВЫ МІКС

Асобным падарункам для жыхароў і гасцей Мазыра у рамках «Марафону адзінства» стала канцэртна-забаўляльная праграма з удзелам артыстаў і вядомых блогераў — «Мы разам!».

Як падзялілася з журналістамі **кіраўнік рабочай групы па арганізацыі і правядзенні «Марафону адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА,** навагодняя тэматыка дапоўніла асноўнае гучанне акцыі.

— Пераднавагодні настрой ва ўсім горадзе, па ўсёй краіне. Праходзіць акцыя «Нашы дзеці», паралельна ідзе мноства дабрачынных акцый, напоўненых дабром, любоўю і святлом. Вядома ж, і наш канцэрт не выключэнне. Шмат навагодніх кампазіцый, прэм'ера ад «Песняроў» і тэматыка «Марафону» таксама. Такі цікавы ў нас атрымаўся мікс — свята і сур'ёзных рэчаў. 2025 год пачнём у Салігорску. Запрашаем усіх жыхароў Салігорска і не толькі ў гэтыя святочныя дні пабываць на мерапрыемствах «Марафону адзінства». Будуць цікавы навагодні канцэрт, вялікая праграма для дзяцей, — падзялілася Ганна Лукашэнка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота БелТА.**

# БЕЛАРУСЬ-2024: НА ШЛЯХУ ЎПЭЎНЕНАГА РАЗВІЦЦЯ

## Згадваем самыя важныя факты мінулага года ў жыцці краіны праз словы Прэзідэнта і храналогію падзей



**2024 год быў для краіны няпростым. Але мы пераадолелі ўсе цяжкасці і сустракаем Новы год з упэўненасцю ў заўтрашнім дні і пад мірным небам. Адзіны народ на чале з моцным агульнанародным лідарам — менавіта так цяпер успрымаецца Беларусь і беларусы ў міжнароднай супольнасці.**

**2024-ы быў багаты на яркія падзеі ў жыцці краіны і грамадства. Адбыліся значныя змены ў палітычнай сістэме дзяржавы: запрацавалі змяненні, унесеныя ў Канстытуцыю на ўсенародным рэферэндуме. Самому Асноўнаму Закону споўнілася 30 гадоў. Першы грамадзянін незалежнай Беларусі паляцеў у космас. Мы адзначылі самае важнае свята — юбілей вызвалення ад фашыстаў. З узмацненнем санкцыйнага ціску на Беларусь з боку калектыўнага Захаду ў нашай краіны з'явілася неабходнасць аб'ектыўна даносіць да сусветнай грамадскасці сваю пазіцыю і ўзаемадзейнічаць на альтэрнатыўных пляцоўках. Новымі пунктамі апоры Беларусі ў свеце сталі буйныя інтэграцыйныя аб'яднанні.**

**Згадаем гэтыя падзеі праз іх храналогію і цытаты кіраўніка краіны. Нам ёсць чым ганарыцца. Нам ёсць куды ісці наперад па гэтым шляху — шляху развіцця і стваральнай працы.**



### Адзіны дзень галасавання. 25 лютага 2024 года

*Роля парламента будзе павышацца. Штомесяц, штогод. Частку паўнамоцтваў мы ўжо перадаём парламенту і іншым органам улады. Ідзе пэўная перабудова, пакаленні мяняюцца. Мы заўсёды казалі, што ўсюды ўсе працэсы павінны насіць эвалюцыйны характар. Калі пайсці рэзка — таксама можна зараз, але гэта рэвалюцыя. Мы спакойна ідзём, мадэрнізуючы сваю сістэму.*



Унікальны выпадак: канкрэтная дата — 25 лютага 2024 года — запісана ў новай рэдакцыі нашай Канстытуцыі, прынятай на ўсенародным рэферэндуме ў лютым 2022-га. Дата, якая знамянуе значную рэфармацыю палітычнай сістэмы Беларусі, дата адзінага дня галасавання. У гісторыі нашай незалежнай дзяржавы ён праводзіўся ўпершыню — калі адначасова грамадзяне краіны выбіралі дэпутатаў усіх ступеняў прадстаўніцтва — ад Палаты прадстаўнікоў да сельскіх Саветаў. Выбары былі незвычайныя нават у практычным плане: замест аднаго бюлетэня людзі атрымлівалі па два, па тры, а жыхары сельскай мясцовасці — па чатыры (па колькасці заканадаўчых органаў, у якія выбіралі сваіх прадстаўнікоў).

Выбары і галасаванне забяспечвалі 6805 выбарчых камісій. У іх склад уключаны 66 692 чалавекі. У краіне працавалі 45 505 нацыянальных і 294 замежныя (міжнародныя) назіральнікі.

У адзіны дзень галасавання выбрана 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 12 511 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яўка выбаршчыкаў склала 73,1 %. Яўка сярод моладзі, якая галасавала ўпершыню, склала каля 77 %.



### 30-годдзе Канстытуцыі Беларусі і інстытута прэзідэнцтва. 15 сакавіка 2024 года




*Упэўнены, захаванне канстытуцыйных норм і прынцыпаў, адказнасць кожнага беларуса за лёс Айчыны будуць і надалей спрыяць дынамічнаму развіццю нашай дзяржавы.*

Сёлета споўнілася 30 гадоў, як была прынята першая ў перыяд незалежнасці Беларусі Канстытуцыя, якая стала сапраўды народным дакументам. Дзякуючы Асноўнаму Закону, удасканаленаму на рэферэндумах воляй большасці беларусаў, створаны ключавыя інстытуты дзяржаўнай улады, гарантаваны правы і свабоды грамадзян.

Гэты дакумент сапраўды лёсавызначальны для нашай краіны і шмат у чым вызначае ход нашай гісторыі. Ён — голас народа, аддадзены за пераемнасць найлепшых традыцый мінулай эпохі, — стаў залогам захавання міру і згоды ў грамадстве. Беспрэцэдэнтны давер грамадзян Беларусі палітычнай сістэме даў магчымасць пабудаваць стабільную і незалежную дзяржаву.

А замацаваныя ў Асноўным Законе фундаментальныя каштоўнасці, такія як сацыяльная справядлівасць, традыцыйная сям'я, гістарычная праўда, дапамагаюць нам пераадольваць сучасныя выклікі і ўпэўнена глядзець у будучыню.

Юбілей Канстытуцыі — гэта адначасова і 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва ў краіне. За час яго існавання грамадзяне Беларусі з'ядналіся як нацыя і адчуваюць адзінства з усімі жыхарамі краіны, у тым ліку прыезджымі. Таксама ў грамадстве склалася разуменне сутнасці дзяржаўнага ладу з выразным размеркаваннем функцый галін улады. Важна і тое, што акрэсліліся найбольш эфектыўныя каналы ўзаемадзеяння па лініі «ўлада — грамадства».

Менавіта праз інстытут прэзідэнцтва выбудавалася стаўленне да дзяржавы як да гаранта справядлівасці, забеспячэння роўных правоў і магчымасцяў для ўсіх грамадзян, абаронцы ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Пры гэтым у фармаце дзяржаўнага кіравання моцная персаніфікаваная ўлада ментальна бліжэй для беларускіх грамадзян: сацыялагічныя апытанні сведчаць, што галоўныя надзеі на дабрабыт і паспяховае развіццё краіны беларусы звязваюць у першую чаргу з Прэзідэнтам, а потым ужо з рэспубліканскімі і мясцовымі органамі ўлады.

### Палёт Марыны Васілеўскай — першага касманаўта незалежнай Беларусі. 23 сакавіка — 6 красавіка 2024 года

*Марына сярод дзвюх імперый — расійская, самая перадавая ў космасе, і амерыканцы. Вы разумееце, гэта не проста імідж. Гэта найвялікшая перамога нашай краіны. Народ наш гэта заслужыў.*

За палётам у космас Марыны Васілеўскай два вясновыя тыдні з цікавасцю і хваляваннем сачыла без перабольшвання ўся краіна. Чаго быў варты адменены аўтаматыкай за некалькі секунд да старту пуск ракеты, які быў перанесены на два дні пазней. Але наша Марына паводзіла сябе надзвычай спакойна і вытрымана ў гэтай нештатнай сітуацыі. Пасля яна два тыдні працавала на МКС нароўні са сваімі таварышамі па экіпажы Героем Расіі ўраджэнцам Беларусі Алегам Навіцкім і астранаўтам НАСА амерыканкай Трэйсі Дайсан. А мы ўжо з гонарам гаварылі аб тым, што Беларусь цяпер — паўнапраўная касмічная дзяржава. За прызямленнем экіпажа таксама сачылі з хваляваннем, ведаючы, што гэта, як і ўзлёт, адзін з самых небяспечных момантаў. Прэзідэнт Беларусі назіраў за адстыкоўкай карабля ў прамым эфіры, а пасля на пытанне журналісткі, ці хваляваўся ён, адказаў так: «Калі твае дзеці будуць у космасе, зразумееш, што такое грамадзянка Беларусі, грамадзянін Беларусі ў космасе»... Марына адчувала, што на Радзіме ганарацца і перажываюць за яе, і першыя словы, якія яна вымавіла на зямлі, былі: «Беларусь, дзякуй за падтрымку!»

Гэты палёт не мог спраўдзіцца без айчынных напрацовак і тэхналогій у гэтай сферы. «Калі б не было развіцця космасу ў Беларусі, з намі ніхто б не размаўляў. Нам бы ніхто і не прапанаваў ляцець у космас», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка падчас цырымоніі, на якой уручаў першаму касманаўту нашай незалежнай краіны найвышэйшую ўзнагароду — Зорку Героя Беларусі.

### VII Усебеларускі народны сход. 24—25 красавіка 2024 года

*Сённяшняя падзея фактычна дзеліць гісторыю палітычнага жыцця краіны на да і пасля. І гэта — эвалюцыйны рух і развіццё. Гістарычнасць моманту вызначаюць не толькі новы статут, новыя функцыі, новыя паўнамоцтвы дэлегатаў. Важна не што, а як мы робім — як удасканальваем мадэль палітычнага ладу. Не ламаючы ўклад, не адмаўляючыся ад традыцый — эвалюцыйна, па-беларуску ўзважана, без рэзкіх рухаў, абапіраючыся на меркаванне большасці.*

Хоць Усебеларускі народны сход, які адбыўся вясной гэтага года, і лічыцца намінальна сёмым, яго, не баючыся памыліцца, можна назваць першым, а дні яго правядзення — гістарычным. Упершыню пасяджэнне сходу праходзіла ў яго новым канстытуцыйным статусе — найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, якому падпарадкоўваюцца ўсе галіны ўлады, меркаванне якога павінен улічваць і кіраўнік дзяржавы. Рашэнні Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў. Як трапна заўважыў Прэзідэнт: «Славянскае веча ў яго сучасным абліччы». Сярод 1200 дэлегатаў сходу, якія будуць у гэтым скліканні працаваць пяць гадоў, — прадстаўнікі ўсіх галін улады, мясцовых Саветаў, грамадзянскай супольнасці.

Менавіта падчас правядзення сходу прагучалі і шырока распаўсюдзіліся словы «Час выбраў нас!»

Старшынёй Усебеларускага народнага сходу быў выбраны дзеючы Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

Дэлегатамі сходу былі прыняты найважнейшыя для жыцця і бяспекі краіны дакументы — Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына. «У гэтых дакументах нашы памкненні і спадзяванні, беларускі шлях у сучасным вельмі небяспечным і неспакойным свеце», — адзначыў у сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка.

Праект Канцэпцыі да яго прыняцця абмяркоўваўся на 80 дыялогавых пляцоўках. Тэкст Канцэпцыі быў абноўлены на 70 працэнтаў. З'явілася абсалютна новае паняцце — «электаральны суверэнітэт». Вызначэнне нацыянальных інтарэсаў дапоўнена прыярытэтным палажэннем Канстытуцыі аб грамадскай згодзе, непахіснасці асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы. Адкарэкціраваны паняцці пагрозы і крыніцы пагрозы нацыянальнай бяспецы, упершыню дадзены вызначэнні рызыкі і выкліку нацыянальнай бяспецы. Сярод пераліку сфер, з якіх складаецца наша нацыянальная бяспека, з'явілася новая — біялагічная бяспека.

### 80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 3 ліпеня 2024 года

*Роўна 80 гадоў таму, 3 ліпеня 1944 года, адгрымелі апошнія баі за сталіцу нашай Беларусі. Але гэтыя залпы і цяпер адгукаюцца рэхам у нашай гістарычнай памяці. І мы ведаем, што павінны зрабіць усё, каб пранесці гэтую памяць праз стагоддзі.*

*У ёй шмат болю і пакут, цярпення і мужнасці, подзвігаў і ўрачыстасці справядлівасці. У ёй сотні тысяч імёнаў герояў. У ёй сіла нацыі спадчыннікаў пераможцаў.*

Увесь адыходзячы год прайшоў пад знакам 80-годдзя вызвалення нашай краіны ад «карычневай» чумы. Гэта сапраўды вялікая дата і вялікая падзея. Бо тут, на беларускай зямлі, вырашалася будучыня многіх народаў. У гэтай лёсавызначальнай бітве сышліся фашысты з усёй Еўропы і воіны вялікай шматнацыянальнай Чырвонай Арміі. Гэта была бітва за свабоду і будучыню нашага народа, за свабоду і будучыню народаў усяго кантынента. Гэта быў значны і ўпэўнены крок да Вялікай Перамогі.

І, адзначаючы гэтую дату, мы аддаём абавязак памяці савецкім салдатам, якія стаялі да смерці ў Брэсцкай крэпасці, пад Мінскам і Магілёвам, Полацкам і Гомелем, Оршай і Быхавам... Мы схіляемся перад подзвігам савецкіх жанчын, старых і дзяцей, якія змагаліся нароўні з мужчынамі і працавалі ў тыле. Мы схіляем галовы перад светлай памяццю мірных ахвяр і загінулых герояў. Гэта мільёны людзей. Страшная цана нашай свабоды і незалежнасці.

Сёння як ніколі важна памятаць самы галоўны ўрок Вялікай Айчыннай вайны: нацызм — гэта абсалютнае зло. Злачынствам нацыстаў няма і не можа быць апраўдання і прабачэння. Ні тады, ні цяпер, ні ў будучыні. Пра гэта павінны памятаць тыя, хто зноў сее варожасць паміж народамі, спрабуючы ўцягнуць іх у новую крывавую бойню.

Цяперашняе пакаленне будуе сваю будучыню, абапіраючыся на мужнасць ветэранаў, якія сталі прыкладам самаахвярнага служэння Радзіме, сімвалам адданасці Беларусі. Сёння ў краіне пражывае каля 8,4 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў канцлагераў, членаў сем'яў ваеннаслужачых (партызан, падпольшчыкаў), якія загінулі ў гады вайны. Усе яны ахоплены клопатам з боку дзяржавы: у краіне дзейнічае эфектыўная сістэма льгот і адраснай сацыяльнай падтрымкі ветэранаў. Гэта дзяржаўныя льготы ў сферы аховы здароўя і санаторна-курортнага лячэння, па праездзе, у жыллёвай сферы і шэраг іншых.

### Паўнавартаснае членства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. 4 ліпеня 2024 года

*Найлепшым адказам на выклікі ў глабальнай палітыцы будуць нашы адзінства і згуртаванасць. Для гэтага мы павінны кансалідавацца на той прасторы, якая з'яўляецца зонай адказнасці арганізацыі (Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — Заўв. рэд.). Менавіта такі падыход вызначае неабходнасць стварэння вялікай Еўразіі.*

Адпаведнае рашэнне было падпісана падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Астане. Такім чынам, Беларусь стала паўнавартасным, дзясятым па ліку членам «сям'і ШАС».

Аналагічным статусам у арганізацыі валодаюць Індыя, Іран, Казахстан, Кітай, Кыргызстан, Пакістан, Расія, Таджыкістан і Узбекістан.

«ШАС для Беларусі не проста міжнародная арганізацыя. Гэта стратэгічная перспектыва. Перш за ўсё ў гандлёва-эканамічным і інвестыцыйным узаемадзеянні, развіцці транспартна-лагістычнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і іншай інфраструктуры», — падкрэсліў на саміце Аляксандр Лукашэнка.

З уступленнем Беларусі ў ШАС пашыраецца не толькі геаграфія гэтай арганізацыі, але і сфера яе ўплыву. Краін-заснавальніц было шэсць, і ў момант станаўлення былі толькі пытанні бяспекі. Зараз на парадку дня вялікі блок эканамічных кірункаў сацыяльна-гуманітарнага супрацоўніцтва — гэта ўсе тыя сферы, якія актуальныя і для Беларусі. Для краіны адкрываюцца вельмі сур'ёзныя гарызонты.

Цяпер Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва аб'ядноўвае 10 дзяржаў-членаў з тэрыторыяй каля 36 млн кв. км, насельніцтвам звыш 3,4 млрд чалавек. Доля арганізацыі ў сусветным ВУП складае каля 1/4, у міжнародным гандлі — перавышае 15 %.

### Беларусь — краіна-партнёр БРІКС. 24 кастрычніка 2024 года

*БРІКС — гэта супольнасць будучыні. Па сваім патэнцыяле яна можа наблізіць канец гісторыі дамінавання калектыўнага Захаду, які аказаўся няздольным несці адказнасць за цывілізаванае развіццё міжнародных адносін. У сілах дзяржаў — удзельніц БРІКС зрабіць так, каб рэальныя рычагі ўплыву перайшлі ў рукі прагрэсіўнай сусветнай большасці.*



На саміце БРІКС у расійскай Казані ў кастрычніку 2024 года была прапанавана новая катэгорыя дзяржаў, якія маюць дачыненне да БРІКС, — 13 дзяржаў, у іх ліку Беларусь, атрымалі статус «краін — партнёраў БРІКС».



Зараз у аб'яднанне ўваходзяць дзевяць дзяржаў (Саудаўская Аравія пакуль не пацвердзіла свой статус): Бразілія, Расія, Індыя, Кітай, Паўднева-Афрыканская Рэспубліка, Іран, ААЭ, Егіпет, Эфіопія. Асноўнай мэтай міждзяржаўнага аб'яднання можна назваць развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, умацаванне палітычных сувязяў паміж краінамі-ўдзельніцамі і садзейнічанне рэформам у міжнародных фінансавых інстытутах.

Доля краін БРІКС у сусветным валавым унутраным прадукце (ВУП) ужо перавышае паказчык Групы сямі (G7) і працягвае расці.

Доля краін БРІКС па выніках 2023 года ў сусветнай эканоміцы склала рэкордныя 35,7 працэнта, павялічыўшыся за год на 0,6 працэнтнага пункта. У 2006 годзе з моманту стварэння аб'яднання ўдзельная вага яго вырасла на 10,2 працэнтнага пункта ў эканоміцы.




Дарэчы, як паведамляе МЗС Расіі, з 1 студзеня 2025 года Беларусь афіцыйна стане партнёрам БРІКС. Да арганізацыі далучаюцца таксама Балівія, Інданезія, Казахстан, Куба, Малайзія, Тайланд, Уганда, Узбекістан. Акрамя гэтых дзевяці краін, яшчэ чатыры дзяржавы атрымалі запрашэнне стаць партнёрамі БРІКС.

### Старшынство ў Еўразійскім эканамічным саюзе. 26 снежня 2024 года



*Наш саюз яшчэ досыць малады, але ў яго развіццё ўжо ўкладзена вельмі шмат сіл, энергіі і сродкаў. Мы ў адказе за тое, каб ён і далей развіваўся на карысць нашых народаў і на справе стаў бы сапраўдным полюсам эканамічнага прыцягнення ў сучасным свеце. Я абсалютна перакананы, гэта нам па сілах.*

Менавіта ў гэты дзень пад Санкт-Пецярбургам адбылося пасяджэнне Вышэйшага савета Еўразійскага эканамічнага саюза, на якім старшынство перайшло Беларусі. Адзначым, что ў складзе саюза — пяцёрка асноўных удзельнікаў — Беларусь, Расія, Казахстан, Арменія, Кыргызстан — і некалькі краін-назіральнікаў — Азербайджан, Куба і Малдова.

Да канца першага дзесяцігоддзя свайго існавання ЕАЭС падышоў са значнымі якаснымі і колькаснымі паказчыкамі. Сёння саюз — гэта агульны рынак, які аб'ядноўвае пяць краін з насельніцтвам больш за 184 мільёны чалавек. За час свайго існавання сукупны ВУП краін Саюза вырас з 1,6 да 2,5 трыльёна долараў у эквіваленце. У два разы — аб'ём узаемнага гандлю, а тавараабарот з трэцімі краінамі павялічыўся на 60 працэнтаў — з 579 да 923 мільярдаў долараў.

Фота БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Герой нашага часу

# «ЖАДАЮ, КАБ ЗДАРАЛІСЯ ТОЛЬКІ ШЧАСЛІВЫЯ СІТУАЦЫІ!»

## Віцебскі ратавальнік Канстанцін ГІРКАЛА аб прафесіі і баявым хрышчэнні

**13 снежня ў Віцебску загарэўся гандлёвы цэнтр. Пажару такога маштабу ў рэгіёне ніхто не памятае. На шчасце, дзякуючы зладжаным дзеянням супрацоўнікаў МНС, абышлося без чалавечых ахвяр. А некалькі канкрэтных ратавальнікаў за лічаныя дні сталі народнымі героямі. З адным з іх — майстрам-ратавальнікам пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Віцебскага гарадскога аддзела МНС Канстанцінам Гіркалам — напярэдадні Новага года мы пагаварылі аб прафесійным шляху і марах.**



Цяпер Канстанціну 32 гады, за плячыма — крыху больш за 10 гадоў службы ў радах МНС. Але да сваёй прафесіі малады чалавек прыйшоў выпадкова, бо вышэйшую адукацыю спачатку атрымліваў па зусім іншым профілі: у дыпломе Гіркалы — «выкладчык фізічнай культуры і спорту». Яшчэ будучы на трэцім курсе ВДУ імя П. М. Машэрава ён зацікавіўся прафесіяй ратавальніка, і пасля ўніверсітэта быў накіраваны ў Новалукомль. Потым у Віцебскім гарадзеле вызвалілася месца, і карэнны віцябчанін вярнуўся на радзіму, у часці № 1 працуе і дагэтуль.

«Тады для службы было патрэбна толькі моцнае здароўе, а яно ў мяне ёсць. Было цікава паспрабаваць сябе ў прафесіі, якая лічыцца адной з самых небяспечных. Бацькі падтрымалі. На першым працоўным месцы ўваходзіць у курс справы было часам складана. Дзякуй старэйшым калегам, якія падставілі тады сваё плячо. На першых пажарах, вядома, было страшна, але за гады ад страху пазбавіўся», — успамінае ратавальнік.

Першая часць гараддзела знаходзіцца ў цэнтры горада на Дзвіне, таму і з'яўляецца адной з самых выязных. Бывае, што за суткі паступае больш за пяць выклікаў, бываюць дні, але вельмі рэдка, калі ў абласным цэнтры спакойна. У ліку сітуацый, на якія рэагуюць ратавальнікі, — пажары, дарожна-транспартныя здарэнні, дапамога, калі хтосьці дзесьці захрас. У ліку самых нетыповых выездаў Канстанціна такія: гараджане заўважылі на дрэве саву і папрасілі вывесці яе за горад; у каналізацыйны люк зваліўся сабака — прыйшлося даставаць; летам суседзяў пчаляра пужаюць пчолы — выязджалі і на вырашэнне такой праблемы. Выезд, які ў падрабязнасцях застанецца ў памяці не толькі Косці, але і многіх яго калег, быў увечары 13 снежня 2024 года.

«Мы знаходзімся блізка да гандлёвага цэнтра, за некалькі хвілін прыбылі на месца. Пажару такой велічыні і моцы я не бачыў ніколі, не бачылі такога і старэйшыя ратавальнікі, стаж якіх большы за 20 гадоў. Плошча ўзгарання — каля дзвюх тысяч квадратных метраў. Больш як 200 чалавек былі хутка эвакуіраваны, але на чацвёртым паверсе засталіся людзі, якія не змаглі знайсці выхад», — успамінае падзеі снежаньскага вечара суразмоўца.

На чацвёртым паверсе клікала на дапамогу жанчына са швейнай майстэрні. Ратавальнікі падагналі машыну з аўталесвіцай, Гіркала падняўся па ёй, каб дапамагчы спусціцца. Яна ўжо наглыталася дыму, жанчыну забралі ў рэанімацыю. Гэта не першы выпадак, калі Косця выратоўваў чалавека, аднак спускаць пацярпелага з такой вышыні па аўталесвіцы для ратавальніка было ўпершыню. «Я не лічу гэты ўчынак асаблівым. Па-першае, гэта мой працоўны абавязак, па-другое — спрацавала ўся каманда», — расказвае Гіркала.

Пасля таго, як жанчына была перададзена медыкам, малады чалавек з напарнікам зноў падняліся на чацвёрты паверх праз акно, каб працягнуць пошук пацярпелых. У цяжкім чорным дыму арыентавацца было вельмі складана, праз пэўны час па-здрадніцку запішчаў балон за спінай, даючы зразумець, што кісларод восьвось скончыцца. «На імгненне я паддаўся паніцы, не мог знайсці акно, праз якое быў выхад на вуліцу. Калі знайшоў, зняў маску, хапаючы свежае паветра. Але пэўную колькасць дыму таксама схапіў — з лесвіцы мяне ўжо здымалі таварышы», — дзеліцца Канстанцін.

Маладога ратавальніка забралі ў рэанімацыю, там высветлілася, што ён атрымаў яшчэ і апёк парай на руцэ. Праз тры дні героя выпісалі, у бальніцу да яго прыязджаў міністр МНС Вадзім Сіняўскі.

Успамінаючы пажар у гандлёвым цэнтры, Канстанцін упэўнены, што шматлікія вучэнні, на якіх адпрацоўвалася менавіта такая сітуацыя, дапамаглі спрацаваць зладжана і апаратыўна. І, самае галоўнае, пазбегнуць чалавечых ахвяр. Наш герой, які і, напэўна, усе ратавальнікі горада, назваў пажар у гандлёвым цэнтры «баявым хрышчэннем», і ратавальнікам, і ўсім беларусам хочацца, каб такога больш ніколі не паўтарылася.

«Гэта каштоўны вопыт, з якога я вынес урокі. Зрабіў работу над памылкамі, каб больш не аказацца пацярпелым, а заставацца тым, хто пацярпелым дапамагае. А наконт змены прафесіі пасля гэтага выпадку і не думаў. Ідучы ў ратавальнікі, усведамляў, якія рызыкі могуць быць», — з усмешкай расказвае Косця. Дарэчы, на рабоце калегі характарызуюць яго як чалавека заўсёды ўсмешлівага і пазітыўнага. І ў гэтым, прызнаецца малады чалавек, ёсць невялікі сакрэт: ніколі не сумнявацца, што любыя складанасці можна вырашыць.

Напярэдадні Новага года Канстанцін як ратавальнік і як просты чалавек жадае аднаго: каб у людзей здараліся толькі шчаслівыя сітуацыі!

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва героя.**

# Асаблівая ўвага да піратэхнікі

**Для кагосьці — навагодні настрой, а хтосьці сам сабе яго сапсаваў... Петарды не толькі парушаюць спакой грамадзян, а і прыносяць шмат непрыемнасцяў. У прыватнасці, тым, хто бярэ іх у рукі.**

### КРЫВАВЫЯ «ЗАБАВЫ»

Толькі за адны суткі — з 28 на 29 снежня — ад піратэхнікі пацярпелі дзіця і мужчына. У Баранавічах хлопчык 2014 года нараджэння атрымаў апёк пальца кісці з-за выбуху піратэхнічнага вырабу. На шчасце, абышлося без сур'ёзных наступстваў: пасля аказання медыцынскай дапамогі пацярпелы быў накіраваны на амбулаторнае лячэнне.

А вось жыхару Шклова пашанцавала менш. У выніку запуску петарды 38-гадовы мужчына атрымаў сур'ёзныя траўмы і рваныя раны на руках. У двары бацькоўскага дома ён спрабаваў выкарыстаць петарду, якая ўзарвалася ў руцэ. Гэтая «забава» каштавала мужчыну некалькіх пальцаў на руцэ.

«Больш падрабязна гэтыя абставіны зараз будуць высвятляцца, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Разам з тым мы аналізуем у тым ліку абстаноўку і ў краінах блізкага замежжа. У нас ёсць падставы лічыць, што пачасціліся выпадкі заўчаснай спрацоўкі піратэхнічных вырабаў. Гэта сведчыць у першую чаргу аб тым, што нават калі вы выконваеце ўсе рэкамендацыі па бяспецы, існуе рызыка атрымаць траўму пры выкарыстанні піратэхнікі».

### ПАТРАБУЙЦЕ СЕРТЫФІКАТ

Каб выключыць магчымыя рызыкі і не азмрочыць святы трагічнымі здарэннямі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях настойліва рэкамендуе пазбягаць выкарыстання феерверкаў, петард, іншых піратэхнічных вырабаў другога, трэцяга класа небяспекі бытавога прызначэння.

«У першую чаргу для таго, каб захаваць сваё здароўе і жыццё, — акцэнтуе ўвагу Яўген Бараноўскі. — Аб рызыках, якія існуюць, неабходна абавязкова прагаварыць са сваімі дзецьмі, не дапускаць іх да прымянення рознага роду піратэхнічных вырабаў. У выпадку, калі ўсё ж нехта для сябе ўжо вырашыў, што Новы год без феерверкаў — гэта не Новы год, і ўжо запланаваў іх набыццё або выкарыстанне, мы настойліва раім у першую чаргу набываць піратэхнічныя вырабы ў спецыялізаваных крамах. Больш за тое, патрабаваць у прадаўцоў сертыфікат адпаведнасці на выкананне тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза аб бяспецы піратэхнічных вырабаў. Дадаткова кансультуйцеся ў прадаўца аб практыцы прымянення падобнага піратэхнічнага вырабу».

Калі ж вы ўсё-такі вырашылі рызыкаваць сваім здароўем, а можа, нават жыццём, ратавальнікі рэкамендуюць выконваць элементарныя правілы бяспекі пры выкарыстанні феерверкаў, іншых піратэхнічных вырабаў:

— абавязкова пазбягайце месцаў масавага збору людзей і папярэджвайце іх аб магчымым прымяненні вырабу;

— не выкарыстоўвайце піратэхніку побач з будынкамі, збудаваннямі, на паркоўках, каля дрэў, ліній электраперадачы;

— абавязкова чытайце інструкцыю, правярайце тэрмін прыдатнасці піратэхнічнага вырабу, звяртайце ўвагу на цэласнасць упакоўкі.

**У тэму**

### ДАПАМОГА — ПА ПЕРШЫМ ЗВАНКУ

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ** адзначыў, што сур'ёзную заклапочанасць у ратавальнікаў выклікае бяспека ў месцах масавага адпачынку людзей, правядзення мерапрыемстваў:

— На перыяд свят пераведзены міністэрства на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Штосутачна па дыслакацыях нашых пажарных аварыйна-ратавальных службаў будзе задзейнічана 3600 чалавек. Вельмі важна забяспечыць людзей усім неабходным, даць магчымасць адпачыць, быць у гатоўнасці выканаць пастаўленыя задачы».

Асаблівая ўвага — падрыхтоўцы груп ратавання на вадзе. «На жаль, ужо ёсць выпадкі гібелі людзей, у тым ліку выхаду на лёд, хоць яго, па вялікім рахунку, яшчэ няма», — канкрэтызаваў міністр.

Пачынаючы з 14 снежня зарэгістраваны чатыры факты траўміравання грамадзян ад піратэхнікі. Для таго, каб папярэдзіць падобнае, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях настойліва рэкамендуе насельніцтву адмовіцца ад выкарыстання піратэхнічных сродкаў.

Кіраўнік ратавальнага ведамства запэўніў, што МНС будзе гатова да таго, каб аператыўна аказаць дапамогу людзям па першым званку, які паступіць у дзяжурныя часці.

**Дзецям катэгарычна забараняецца запускаць піратэхнічныя вырабы!**

### КАЛІ САЛЮТ НЕ СПРАЦАВАЎ...

Калі піратэхнічны сродак не спрацаваў, пераканайцеся ў тым, што феерверк не пачне страляць, пачакаўшы 10-15 хвілін на бяспечнай адлегласці. Калі праз гэты час нічога не спрацавала, то можна падысці да феерверка. Трэба яго візуальна агледзець, каб пераканацца ў адсутнасці частак, якія тлеюць. Калі такія часткі ёсць, неабходна адыйсці ад салюту на бяспечную адлегласць: такі выраб усё яшчэ ўяўляе пагрозу і можа нанесці вашаму здароўю значную шкоду. Ні ў якім разе нельга нахіляцца над феерверкам, які не спрацаваў. Гэта таксама можа скончыцца сумна!

Калі тлення не відаць, то салют неабходна пакласці ў ваду на некалькі гадзін. Пасля яго неабходна выкінуць разам з бытавым ці будаўнічым смеццем. З харчовымі адходамі неспрацаваны выраб утылізаваць нельга. Катэгарычна забаронена кідаць у вогнішча такія вырабы. Наступствы могуць быць непрадказальнымі...

**Вераніка КАНЮТА.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»**
на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

**Электронные торги состоятся 17.01.2025.**

**Лот № 1:** Педикюрно-косметологическое кресло «Сириус-10», инв. № 18838.
**Лот № 2:** Технологическая мойка для волос Florida Kiss, инв. № 18839.
**Лот № 3:** Ванна ультразвуковая Codyson CD-4830, инв. № 19846.
**Лот № 4:** Лампа LED SN 1 TURBO для сушки ногтей, инв. № 18948.
**Лот № 5:** Лампа LED SN 1 TURBO для сушки ногтей, инв. № 18949.
**Лот № 6:** Аппарат Strong 210/105L 64W (с педалью), инв. № 18950.
**Лот № 7:** Машинка для стрижки волос BaByliss FXFS2GE, инв. № 18953.
**Лот № 8:** Машинка для стрижки волос BaByliss FXFS2GE, инв. № 18954.
**Лот № 9:** Машинка для стрижки волос BaByliss FX7870GSE, инв. № 18955.
**Лот № 10:** Машинка для стрижки волос BaByliss FX7870GSE, инв. № 18956.
**Лот № 11:** Машинка для стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 18957.
**Лот № 12:** Машинка для стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 18958.
**Лот № 13:** Фен BaByliss EXCESS-HQ Ionic 2600W, BAB6990IE, инв. № 18959.
**Лот № 14:** Фен BaByliss EXCESS-HQ Ionic 2600W, BAB6990IE, инв. № 18960.
**Лот № 15:** Стол маникюрный «ПРАКТИК плюс» (белый Н), инв. № 18963.
**Лот № 16:** Зеркало «Дуэт 2» (черный), инв. № 18964.
**Лот № 17:** Мойка для волос ATLANTIS, инв. № 19117.
**Лот № 18:** Кресло на гидравлическом подъемнике «Изо GTS», инв. № 19118.
**Лот № 19:** Кресло на гидравлическом подъемнике «Изо GTS», инв. номер 19119.
**Лот № 20:** Кресло на гидравлическом подъемнике Изо GTS, инв. № 19120.
**Лот № 21:** Машинка для стрижки волос BaByliss FXFS2GE, инв. № 19299.
**Лот № 22:** Машинка для стрижки волос BaByliss FXFS2GE, инв. № 19300.
**Лот № 23:** Машинка для стрижки волос BaByliss, FX7870GSE, инв. № 19301.
**Лот № 24:** Машинка для стрижки волос BaByliss, FX7870GSE, инв. № 19302.
**Лот № 25:** Вытяжка на стойке 4BLANC PRO V1, инв. № 19555.
**Лот № 26:** Аппарат Strong 210/105 I (без педали в сумке 35 000 об./мин.), инв. № 25749.
**Лот № 27:** Ванна ультразвуковая CODYSON CD-4830, 150 Вт, объем 3000 мл, инв. № 25752.
**Лот № 28:** Детское сиденье «Юниор», инв. № 26903.
**Лот № 29:** Кресло «Лесли», инв. № 25049.
**Лот № 30:** Кресло «Лесли», инв. № 25049.
**Лот № 31:** Кресло «Лесли», инв. № 25049.
**Лот № 32:** Кресло «Лесли», инв. № 25049.
**Лот № 33:** Кресло парикмахерское ЮНИОР-5 марки «СаниПоль», инв. № 25207.
**Лот № 34:** Лампа LED SUN 3 для сушки ногтей, инв. № 25960.
**Лот № 35:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX7870GSE, инв. № 25211.
**Лот № 36:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX7870GSE, инв. № 25211.
**Лот № 37:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 25209.
**Лот № 38:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 25209.
**Лот № 39:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 25209.
**Лот № 40:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FX8700E, инв. № 25209.
**Лот № 41:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FXFS2E, инв. № 25210.
**Лот № 42:** Машинка д/стрижки волос BaByliss FXFS2E, инв. № 25210.
**Лот № 43:** Подставка «П-01», инв. № 25209.
**Лот № 44:** Подставка «П-01», инв. № 25209.
**Лот № 45:** Подставка «П-01», инв. № 25209.
**Лот № 46:** Подставка «П-01», инв. № 25209.
**Лот № 47:** Подставка для рук на металлических ножках № 4 белая, инв. № 25751.
**Лот № 48:** Стол маникюрный «ЭКСКЛЮЗИВ ПЛЮС-2» 1300*600*760, инв. № 24970.
**Лот № 49:** Сушуар для волос EGG Dryer Aut, инв. № 24963.
**Лот № 50:** Табурет мастера GIZMO, инв. № 26904.
**Лот № 51:** Табурет мастера MIGUEL, инв. № 24966.
**Лот № 52:** Фен Classic EU 220W GA.MA A11, инв. № 25114.
**Лот № 53:** Фен Classic EU 220W GA.MA A11, инв. № 25114.
**Лот № 54:** Фен EXCESS-HQ IONIC Babyliss 2600W BAB6990IE, инв. № 25227.
**Лот № 55:** Фен EXCESS-HQ IONIC Babyliss 2600W BAB6990IE, инв. № 25227.
**Лот № 56:** Щипцы-выпрямители д/волос Babyliss BAB3000EPE, инв. № 25118.
**Лот № 57:** Щипцы-гофре Babyliss BAB2310EPCE, инв. № 25219.

**Начальная цена с НДС 20 %**
Лота № 1 – 1 440,00 руб.,
Лота № 2 – 600,00 руб.,
Лота № 3 – 180,03 руб.,
Лота № 4 – 49,81 руб.,
Лота № 5 – 49,81 руб.,
Лота № 6 – 377,04 руб.,
Лотов №№ 7, 8 – 174,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 9, 10 – 226,48 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 11, 12 – 213,88 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 13, 14 – 144,70 руб. (за один Лот),
Лота № 15 – 108,00 руб.,
Лота № 16 – 881,20 руб.,
Лота № 17 – 1 200,00 руб.,
Лота № 18 – 112,68 руб.,
Лота № 19 – 112,68 руб.,
Лота № 20 – 112,68 руб.,
Лота № 21 – 224,21 руб.,
Лота № 22 – 224,21 руб.,
Лота №№ 23, 24 – 299,77 руб. (за один Лот),
Лота № 25 – 1 816,50 руб.,
Лота № 26 – 240,00 руб.,
Лота № 27 – 162,00 руб.,
Лота № 28 – 42,00 руб.,
Лота № 29 – 264,00 руб.,
Лотов №№ 30, 31, 32 – 264,00 руб. (за один Лот),
Лота № 33 – 228,00 руб.,
Лота № 34 – 84,00 руб.,
Лотов №№ 35, 36 – 210,00 руб. (за один Лот),
Лота № 37 – 198,00 руб.,
Лотов №№ 38, 39, 40 – 198,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 41, 42 – 162,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 43, 44, 45, 46 – 18,00 руб. (за один Лот),
Лота № 47 – 12,00 руб.,
Лота № 48 – 186,00 руб.,
Лота № 49 – 522,00 руб.,
Лота № 50 – 108,00 руб.,
Лота № 51 – 258,00 руб.,
Лотов №№ 52, 53 – 78,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 54, 55 – 126,00 руб. (за один Лот),
Лота № 56 – 168,00 руб.,
Лота № 57 – 90,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–57: г. Минск, ул. М. Богдановича, 153.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by**, электронной торговой площадке «GOSTORG» **gostorg.by**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

Навагоднія традыцыі

# РЭЙД ДАБРЫНІ І ЎСМЕШКІ

## Дзед Мароз і Снягурка ў пагонах дораць святочны настрой

**Ёсць добрая навагодняя традыцыя ў супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Раз на год яны мяняюць сваю міліцэйскую форму на касцюмы казачных персанажаў — Дзеда Мароза і Снягуркі — і адпраўляюцца віншаваць дзяцей.**

### ШЛЯХ ДА МАРЫ

Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да навагодняга «турнэ» Дзеда Мароза і Снягуркі, якія служаць у Кастрычніцкім РУУС г. Мінска, і асабіста пераканаліся ў тым, што і дзеці, і дарослыя вераць у цуд.

Найперш пазнаёмімся. Дзед Мароз — **старшы ўчастковы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі падпалкоўнік міліцыі Ігар ФІЛАТАЎ,** Снягурка — **старшы інспектар групы кадраў лейтэнант міліцыі Юлія ТРАЦЮК.** Яны загадзя склалі спіс адрасоў, якія патрэбна наведаць за вечар, а таму хутка пераапрануліся і ў аўтамабіль — дарыць святочны настрой.

Для Ігара Філатава ўсё даволі знаёмае: у Дзеда Мароза ён пераўвасабляецца ўжо некалькі гадоў запар. Добра ведае, якога дзіцяці лепш папрасіць толькі прачытаць вершык, а з якім, карыстаючыся момантам, можна і прафілактычную работу правесці. Нягледзячы на тое што ў асноўным участковы інспектар працуе з дарослымі, свой падыход мае і да дзяцей.



У міліцыі Ігар Філатаў — больш як чвэрць стагоддзя. Насіць пагоны вырашыў адразу пасля службы ў арміі. Прызнаецца, што, хутчэй за ўсё, спрацавалі гены: бацька 27 гадоў аддаў армейскай службе. Аднак Ігару бліжэй была міліцыя. Паступіў у Мінскую спецыяльную сярэднюю школу міліцыі, а скончыў Акадэмію МУС (навучанне супала з перыядам трансфармацыі міліцэйскай адукацыі). Першым месцам службы стала Кастрычніцкае РУУС г. Мінска, тут служыць дагэтуль.

Юлія марыла аб міліцэйскіх пагонах з дзяцінства. Яшчэ будучы студэнткай юрыдычнага факультэта рэгіянальнай ВНУ, пачала шукаць, дзе праходзіць пераддыпломную практыку. Вырашыла паспрабаваць свае сілы ў Кастрычніцкім РУУС сталіцы, ёй не адмовілі. Пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы дзяўчыне было гарантавана першае працоўнае месца. Але гэтага Юліі было недастаткова — падчас працоўнай дзейнасці яна вырашыла атэставацца і атрымала доўгачаканыя лейтэнанцкія пагоны. У якасці Снягуркі Юлія наведвае сем'і ўпершыню. Хоць падобны вопыт ёсць: неаднойчы ёй даводзілася пераапранацца ў блакітна-белае футра падчас навучання ў школе.

### ПАДАРУНКІ, ЯКІЯ ПАМЯТАЕШ УСЁ ЖЫЦЦЁ



Юлія Трацюк дагэтуль памятае адзін падарунак, які, быццам бы ад Дзеда Мароза, перадаў ёй бацька — ляльку. Праўда, сёння не ўзгадае, чаму радавалася больш: ляльцы або бацьку, які акурат вярнуўся з камандзіроўкі.

За перадпавагоднія дні міліцэйскія Дзед Мароз і Снягурка паспяваюць наведаць каля дзесяці сем'яў. Бывае і больш. За сцэнарый адказвае Юлія: дзяўчына загадзя прадумвае пытанні, якія будзе задаваць дзецям, рыхтуе загадкі і песні для карагода, калі будзе магчымасць яго паводзіць.

«Нярэдка даводзіцца імправізаваць, — кажа Ігар Філатаў. — Галоўная наша задача, каб дзеці не здагадаліся, хто мы на самай справе, і не пазналі. Многія з дзяцей, нават падлеткі, па-сапраўднаму вераць у Дзеда Мароза. Часам задаюць такія пытанні, што нават і не ведаеш, як адказаць. Напрыклад, цікавяцца, дзе нашы сані, на якіх быццам бы мы павінны былі прыехаць».

Так было і гэтым разам, калі казачныя персанажы віншавалі шасцігадовую Вікторыю. Дзяўчынка ва ўбранні маленькай феі расказала Дзеду Марозу і Снягурцы верш, прызналася, што была паслухмянай, і, вядома, атрымала падарунак. Развітваючыся з нечаканымі гасцямі, Віка спытала: «Дзе вашы алені?» Дзед Мароз і Снягурка, нядоўга думаючы, сказалі, што, паколькі снегу няма, прыехалі яны не на санях з аленямі, а на гарадскім транспарце. Здаецца, гучала пераканаўча.

Па дарозе да іншых дзетак цікаўлюся ў Дзеда Мароза і Снягуркі, а ці верылі яны ў казачных персанажаў у сваім дзяцінстве. Высвятляецца, што верылі.

«Мы былі рады любому падарунку пад ёлкай, — удакладняе Ігар Філатаў. — Нават нягледзячы на складанасці часу — такой колькасці цацак, што бачыць сучасныя дзеці, не было, — нашы бацькі імкнуліся нам стварыць святочны настрой. Прычым гэта былі самыя дарагія падарункі, бо мы дакладна ведалі — іх прынёс сапраўдны Дзед Мароз».

### ПЕРАЎВАСАБЛЕННЕ НА РАДАСЦЬ УСІМ

Па наступным адрасе Дзеда Мароза і Снягурку чакалі ажно чацвёра дзяцей. Гаспадыня, падпалкоўнік міліцыі, вырашыла стварыць свята не толькі ўласным дзецям, але і пляменнікам, якія таксама былі здзіўлены прыходу казачных персанажаў. Атрымалася цэлае навагодняе прадстаўленне! Кожны імкнуўся аказаць на Дзеда Мароза і Снягурку ўражанне: і вершы, у тым ліку на беларускай мове, гэтым вечарам гучалі, і песні, спрабавалі нават каля ёлачкі вадзіць карагод.

Галіна Мікалаеўна, гаспадыня кватэры, развітваючыся з гасцямі, дзякавала за падораны настрой. «Сучасных дзяцей складана нечым здзівіць, але ў вас гэта атрымалася, — падзялілася жанчына. — Усе рыхтаваліся, чакалі. Дачушцы 12 гадоў, але яна з такім задавальненнем вучыла верш, бо дагэтуль верыць у Дзеда Мароза».

Павіншаваўшы і дзяцей, і дарослых з надыходзячымі святамі і пажадаўшы самага найлепшага, Дзед Мароз і Снягурка накіраваліся па іншых адрасах. Было бачна, што такое пераўвасабленне ім самім даспадобы.

«У дзяцей павінна быць свята, інакш для чаго мы жывём, — перакананы Дзед Мароз. — Для чаго міліцыянер ходзіць на работу? Каб правапарушэнняў было менш, каб чалавек адчуваў сябе абароненым, мог спакойна хадзіць па нашых вуліцах».

Таму і ў навагоднюю ноч супрацоўнікі органаў унутраных спраў праводзяць на службе: сочаць за правапарадкам у месцах масавых гулянняў, удзельнічаюць у іншых мерапрыемствах, якія ўплываюць на тое, каб святы прайшлі весела, а галоўнае — спакойна. Не будзе выключэннем і бліжэйшая навагодняя ноч. Таму такое «турнэ», звязанае з дзіцячымі ўсмешкамі, для Дзеда Мароза і Снягуркі ў пагонах — нагода максімальна акунуцца ў святочную атмасферу, адчуць навагодні настрой і самім паверыць у цуд.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# СВЯТКУЕМ РАЗАМ



## Брэст: танцы на плошчы Леніна

Брастаўчан чакае «Навагодняя ноч на плошчы Леніна». Арганізатары абяцаюць незабыўныя першыя гадзіны 2025 года, заклікаюць браць з сабой добры настрой, кампанію сяброў і запрашаюць гараджан на грандыёзную дыскатэку каля галоўнай ёлкі горада. Праграма пачынаецца ў гадзіну ночы. Удзельнікам прапануюцца вясёлыя танцы, віншаванне Дзеда Мароза і Снягуркі, а таксама выступленне таленавітых салістаў і вакалістаў горада.

Плошча Леніна ўжо гатовая да сустрэчы сяброў. Прыгожа ўбраная ёлка, агні гірлянд і святочная ілюмінацыя абяцаюць стварыць асаблівы настрой.

Святочная дыскатэка з конкурсамі і падарункамі «Новы год на экватары» пройдзе з гадзіны да чатырох раніцы каля гандлёвага цэнтра «Экватар» па вуліцы Гаўрылава. Арганізатары падрыхтавалі феерверк, які расквецíць неба ў дзве гадзіны ночы.

## Гомель: лакацыі ў кожным раёне

У Гомелі масавыя гулянні з нагоды сустрэчы Новага 2025 года разгарнуцца на цэнтральнай плошчы імя Леніна. Святочныя лакацыі тут будуць чакаць гасцей з паловы дванаццатай 31 снежня да трох гадзін першага дня Новага года. Гарадскія ўлады падрыхтавалі насычаную святочную праграму і на працягу ўсяго дня першага студзеня. Забаўляльныя навагодія лакацыі разгарнуцца ў кожным раёне Гомеля.

Праваахоўнікі Гомельшчыны звяртаюць увагу на тое, што для правядзення святочных мерапрыемстваў у Гомелі і шэрагу райцэнтраў вобласці будзе зменены рух транспарту. У абласным цэнтры з 22 гадзін 31 снежня да чатырох гадзін раніцы 1 студзеня будзе перакрыта для руху плошча імя Леніна. На вуліцах Білецкага, Ланге, Сялянскай, завулку Спартака ў Гомелі ўладкуюць дадатковыя паркоўвачныя месцы. У абласным цэнтры таксама будзе абмежаваны рух на плошчы ў Касцюкоўцы, зменены рух у мікраёне Новае Жыццё на скрыжаванні вуліц Механічнай і Федзюнінскага.

## Віцебск: святочны настрой у «Навагоднім трамваі»

Пракаціцца ў «Навагоднім трамваі» да 14 студзеня запрашаюць Віцебскі абласны краязнаўчы музей і ААТ «Віцебскаблаўтатранс». Падчас бясплатнай экскурсіі па горадзе на Дзвіне ўсіх ахвотных пазнаёмяць з гісторыяй Віцебска і віцебскага трамвая, а Дзед Мароз і Снягурка ў грамадскім транспарце павіншуюць гараджан са святамі.

На плошчы Перамогі ў Віцебску ў навагоднюю ноч з 23:50 да 3:00 гараджане і госці культурнай сталіцы стануць удзельнікамі канцэртна-танцавальнай праграмы «З Новым годам, любы горад!». У 2:00 неба над горадам на Дзвіне ўпрыгожыць святочны феерверк. 1 студзеня 2025 года на плошчы Перамогі з 12:00 да 15:00 адбудзецца навагодняя культурна-забаўляльная праграма для дзяцей са спартыўнымі спаборніцтвамі і конкурсамі, а ўвечары таго ж дня з 19:00 да 21:00 віцябчан запрашаюць на канцэртна-танцавальную праграму «З Новым годам!».

## Магілёў: збірае плошча Адзінства

Сёння, напярэдадні самага любімага і чаканага свята — Новага года, горад Магілёў атрымлівае доўгачаканы падарунак — новы падземны пераход на скрыжаванні праспекта Пушкінскага і вуліцы Астроўскага, які дасць магчымасць бяспечна перамяшчацца пешаходам і значна паскорыць праезд скрыжавання на адной з цэнтральных артэрый горада. Будаўніцтва важнага для горада аб'екта адбылося ў рамках рэканструкцыі Пушкінскага праспекта.

Навагоднюю ноч жыхароў і гасцей Магілёва запрашаюць правесці на плошчы Адзінства — тут з першай гадзіны да чатырох раніцы 1 студзеня 2025 года ўсіх аб'яднае святочная праграма «Душэўны Новы год». Гулянне «Навагодні карагод» пройдзе і на іншых адкрытых пляцоўках горада. Увечары 1 студзеня плошча Адзінства зноў заклікае гасцей на навагоднюю дыска-праграму «Гарачая зіма ў Магілёве, альбо Душэўны Новы год 2».

2 студзеня апоўдні парк у Падніколлі чакае ўдзельнікаў сямейнага свята «Мароз пацехам не перашкода», а ўвечары, а 17 гадзіне, Тэатральны сквер распачынае інтэрактыўную праграму «Час казачных задум у Тэатральным».

## Гродна: майстар-класы ад Дзеда Мароза

Навагодняя ноч у Гродне пройдзе пад слоганам «Лёд і Рок». Стаўка будзе зроблена на кавер-групы. Праграма пачнецца ў гадзіну ночы 1 студзеня 2025 года, яшчэ праз гадзіну — феерверк, затым — забаўляльная праграма. Упершыню ў Гродне будзе святкавацца і Стары Новы год. Мерапрыемства пройдзе 12 студзеня на Савецкай плошчы і завершыць святочны марафон, у якім чакаецца шмат цікавага.

У сувязі з правядзеннем навагодніх свят зменіўся рух па плошчы Леніна. Транспартныя патокі больш скіраваны да абласнога драмтэатра. Таксама ў навагоднюю ноч будуць арганізаваны дадатковыя маршруты грамадскага транспарту, якія дазволяць гараджанам дабрацца дамоў пасля святочнай праграмы.

Навагодняя атмасфера створана ў галоўных турыстычных лакацыях рэгіёна — Мірскім і Старым замку. Тут стварылі калядныя фотазоны і падрыхтавалі нямала сюрпрызаў. Музеі адчыняць свае дзверы на другі дзень Новага года. Напрыклад, у Міры па традыцыі пройдзе калядны баль «Зімовая казка», дзе ўдзельнікі атрымаюць майстар-клас па бальных танцах, а дэкаратары запрашаюць у майстэрню па вырабе ёлачных цацак, якая будзе працаваць 3 і 4 студзеня.

Стары замак пачне працаваць з 3 студзеня. Тут чакаюць прыток турыстаў, таму робіцца акцэнт на арганізацыю работы і прыём турыстычных груп.

У навагоднім цераме Дзеда Мароза і Снягуркі, які размясціўся на плошчы Савецкай у Гродне, мяркуецца правядзенне шматлікіх майстар-класаў.

Традыцыйна 1 студзеня ў Гродне пройдзе так званы «Забег цвярозасці». Мяркуецца, што сёлета ў ім прыме ўдзел больш як 300 чалавек. Яны прабягуць чатыры кіламетры ў лесапарку «Пышкі». Старт будзе дадзены ў 12 гадзін.

## Мінск: галоўная пляцоўка — каля Палаца спорту

У Мінску запланавана вялікая колькасць калядных і навагодніх мерапрыемстваў, расказаў **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Сяргей ГАРОХАЎ.**

— Усяго больш за 400 лакацый, — удакладніў ён. — У навагоднюю ноч у сталіцы асноўныя мерапрыемствы будуць праводзіцца на пляцоўцы каля Палаца спорту з 0.30 да 4.00. Пры правядзенні святочных мерапрыемстваў рашэннем Мінгарвыканкама ўзгоднена рэалізацыя алкаголю ў разліў, аднак выключна ў месцах правядзення асноўных мерапрыемстваў, кірмашоў каля Палаца спорту, а таксама на раённых пляцоўках. На мерапрыемствы на пляцоўцы каля Палаца спорту можна будзе прыбыць праз КПП па напрамках з боку пр-та Пераможцаў, дом № 2, праз падземны пераход каля ГЦ «Галерэя» і непасрэдна ў раёне Палаца спорту. Прадугледжаны асобныя пункты пропуску для інвалідаў, ветэранаў, бацькоў з малалетнімі дзецьмі. Яны будуць пазначаныя аранжавым тэнтам.

Каб прадухіліць чэргі ў месцах пропуску, праваахоўнікі просяць грамадзян прыбываць на мерапрыемствы загадзя і абмежавацца наяўнасцю пры сабе толькі самых неабходных рэчаў. Сяргей Гарохаў паведаміў, што перад кожным КПП будзе размешчаны інфармацыйны стэнд з указаннем тых рэчаў, якія забароненыя да праносу. Такую маёмасць можна будзе пакінуць у камеры захавання.

Праходзіць на мерапрыемства з хатнімі жывёламі, веласіпедамі, сродкамі персанальнай мабільнасці таксама будзе забаронена. Дапускаецца праносіць безалкагольныя вадкасці ў пластыкавай празрыстай тары аб'ёмам не больш за 0,5 літра, адзначыў начальнік упраўлення аховы правапарадку.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 20 %

Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1. Продавец: ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Торги состоятся 20 января 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лоты №№ 2, 3, 4, 5, 6), необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя. **Лоты №№ 2, 3, 4: информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 872/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1. **Лоты №№ 5, 6: информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100003004079** общей площадью **0,6706 га – для строительства и обслуживания административно-управленческого корпуса** (земельный участок для размещения объектов административного назначения) (**право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 189/250). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д. Красный, 2 | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м,** назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина. **Капитальное строение с инв. № 320/С-14328** общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | **240 192,00** | 24 019,20 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36131** площадью **1 492,7 кв. м,** назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **изолированное помещение № 1. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2Н-1. **Обременение:** ипотека | **528 000,00** | 52 800,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36134** площадью **589,1 кв. м,** назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 3. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2Н-3. **Обременение:** ипотека | **145 920,00** | 14 592,00 |
| 4 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36139** площадью **739,8 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение №8**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2Н-8. **Обременение:** ипотека | **180 480,00** | 18 048,00 |
| 5 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36340** площадью **3 929,4 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **административно-управленческий корпус**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2-1. **Обременение:** ипотека | **1 272 960,00** | 127 296,00 |
| 6 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-36341** площадью **363,00 кв. м,** назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – **нежилое изолированное помещение**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2-1. **Обременение:** ипотека | **169 920,00** | 16 992,00 |

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (029)237-54-6 – Макаревич Олег Васильевич.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** BY10 AKBB 3012 0310 1009 6000 0000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №… (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 декабря 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 16 января 2025 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты на публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи.** Проводится аукцион в соответствии с Положением ЗАО «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.11.2024 г. № 230 (30364).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов **https://ocenkaservis.by (раздел «Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Организатор аукционных торгов**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**



# СТО ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ

**Змалку яна зведала горкі сірочы хлеб, была вывезена на прымусовыя работы ў Германію, самаадданa працавала на пошце, годна пераадольвала выпрабаванні лёсу**

**Жыццё пражыць, часта кажуць, — не поле перайсці. А вось калі ў жыцці адзначана ўжо сотая гадавіна з дня нараджэння і пры гэтым захаваліся добрая памяць, яснасць розуму, ды адмысловае пачуццё гумару разам з іранічным стаўленнем да сваёй персоны... То гэта ўжо не проста жыццё — гэта дар божы. Варта сказаць, што на жыццёвы шлях Ніны Сямёнаўны МАРТЫНЮК выпала столькі выпрабаванняў, што хапіла б, пэўна, на некалькі жыццяў.**

## ГАЛОЎНЫ ЎСПАМІН ДЗЯЦІНСТВА: КАЛІ ХОЧАЦЦА ХЛЕБА

— Сама сабе не веру, што мне сто гадоў! — сустракае нас з парога гаспадыня. — Вядома, гэту дату адзначылі, усе мяне віншавалі, кветкі дарылі, пашпарт новы выдалі: «На, маўляў, бабка, жыві яшчэ сто гадоў»... А прайшло колькі дзён, неяк між іншым успомню, і падаецца, што гэта ўсё не са мной было, хто наогул прыдумаў, што мне сто гадоў?! — шчыра ўсміхаецца.

Ну і праўда, хіба гэтай жанчыне дасі сто гадоў? Вядома, узрост бярэ сваё, хадзіць ёй цяжкавата, крыху недачувае, але яна жвавая па натуры, актыўная па характары, цікаўная да жыцця. Пра сваё дзяцінства, пра першыя дні вайны, пра гады ў Германіі расказвае з падрабязнасцямі, дэталямі, нібы гэта было ўчора.

А вось жа цэлае стагоддзе прайшло, як у невялікай вёсцы Ганцавічы Камянецкага раёна нарадзілася дзяўчынка. Лёс падрыхтаваў ёй выпрабаванні з маленства. Калі малой было сем гадоў, не стала бацькі, а ў свае дзесяць яна ўжо была круглай сіратой.

Менавіта з гэтага ўзросту працавала. За міску кашы, кашулю на плячах ды магчымасць пераначаваць. У асноўным пасвіла кароў. Расказвала, што бывала і такое, калі ноччу малое дзіця гаспадароў калышаш, а днём ужо кароў гоніш у поле. І самае цяжкае ўражанне дзяцінства, што заўсёды хацелася хлеба: «Гаспадары таксама небагатыя былі. Усё, што елі самі, — кашу, суп — давалі малой пастушцы, а хлеба — не. Але хлеба вельмі хацелася. Бывае, прасачу, калі яны пойдуць у хлеў даглядаць скаціну, шмыгну на кухню, адрэжу сабе лустачку хлеба і схаваю, каб ранкам у полі з'есці... А цяпер вось жонка ўнука кажа, бывае: «Пайду ў іншы магазін, бо ў гэтым не было такога ёгурту, які Мішка любіць». Мішка — яе сын, а мой — праўнук. А мне ў Мішавым узросце хлеба заўсёды хацелася... Такая доля сірочая».



Ірына БАТУРА і Ніна МАРТЫНЮК.

## У НЯМЕЦКІМ РАБСТВЕ

Калі пачалася вайна, Ніна таксама жыла ў чужой сям'і. Іх вёска амаль каля самай граніцы была, ноччу пачулі грукат, думалі, гром: «Раніцай гляджу ў акно: немцы едуць па вуліцы». Аднойчы пайшла да сваёй цёткі ў вёску Селяховічы пагасцяваць. А там фарміравалі групы моладзі для адпраўкі ў Германію. Дачка мясцовага старасты была ў спісах. Ён зрабіў усё, каб замест яе паехала Ніна. Везлі ў вялікіх вагонах, згадвае Ніна Сямёнаўна, дарога была доўгай, цяжкай. А прывезлі, выгрузілі, размясцілі ў нейкай будыніне накшталт адрыны, туды прыязджалі гаспадары і выбіралі сабе работнікаў.

«Усіх разабралі, я засталася амаль апошняя, — успамінае суразмоўніца. — Маленькая, хударленькая была, думалі, што з мяне работніка не будзе. Мой гаспадар таксама прыпазніўся, ну, і забраў мяне. Калі прывёз дадому, жонка яго пачала сварыцца. Я не разумею, чую толькі: «Schule, Schule!» Потым паляк-работнік мне сказаў, што яна ўшчувала мужа за тое, што ўзяў дзіця, якому ў школу трэба. Так я выглядала, але ж як стала працаваць, то чула ад іх толькі пахвалу... Але ж чужына ёсць чужына, ды і ставіліся да мяне ўсё роўна як да парабка».

## СУПРАВАДЖЭННЕ ПАШТОВАЙ МАШЫНЫ

— Калі нас вызвалілі, — працягвае Ніна Сямёнаўна, — мяне паклікалі ў вайсковую часць за перакладчыка. Яны вызвалялі паселенні, дзе было шмат палонных, трэба было людзей «сартаваць», вось і дапамагала штабістам. Тыя гаспадары, дарэчы, бяздзетныя, прапаноўвалі мне застацца ў іх. Але ж дзе там, хоць мяне ніхто не чакаў, хацелася на радзіму, у родныя мясціны. У 1945-м прыехала дадому. Адзін нягеглы сваяк ужо і хату маіх бацькоў прадаў. Пайшла да цёткі, засталася нанач, а ранкам чую, як яна кажа сыну: «Ну, і куды мы яе дзяваць будзем?» Паднялася, развіталася і пайшла ў Брэст».



Каля паштовай машыны ў 1950-я гады.

У горадзе адшукала далёкую радню, яны дапамаглі ўладкавацца на пошту. Некалькі гадоў насіла тэлеграмы.

«Тады дастаўка была не такая, як цяпер, — расказвае гераіня. — Сёння сеў у машыну і прывёз, а тады тэлеграм паступала шмат, трэба было іх аператыўна разнесці. Транспарт — уласныя ногі. Бывае, прыйду ў гэту Кавалёўку (тады — вёска, цяпер — мікрараён, дзе жыве Ніна Мартынюк. — **Аўт.**) у гумовых ботах і ледзьве ногі выцягну з балота. Нічога, спраўлялася».

У 1951 годзе выйшла замуж, нарадзіўся сын, але муж памёр праз чатыры гады. Сына ўзнімала адна.

У 1950-х ёй даверылі адказную пасаду — суправаджаць пошту з Брэста ў райцэнтры. Ехалі на грузавіку ўдваіх з вадзіцелем, кожны меў зброю, пісталет сістэмы «наган». Вядомая справа: паштовая машына везла каштоўныя грузы, у тым ліку грошы, а ў навакольных лясах бандыты сноўдаліся. Аднойчы Ніна з вадзіцелем нават трапілі ў такую сітуацыю, калі ад іх патрабавалася рашучасць, уменне рэагаваць імгненна. Так што наша гераіня — з кагорты смелых.

## ТРАЎМА, ВЫЗДАРАЎЛЕННЕ, ПАДТРЫМКА АД КАЛЕКТЫВУ

Некалькі разоў Ніна Сямёнаўна была на мяжы жыцця і смерці. Першы раз — калі цяжарная ўпала з гарышча, таму сынок нарадзіўся на два месяцы раней тэрміну. Потым — калі машына трапіла ў аварыю... А дзень 12 красавіка 1961 года для яе стаў асаблівым, і не толькі знамянальным палётам у космас першага чалавека. Як яна цяпер жартуе: «У той дзень Гагарын уверх паляцеў, а я — уніз». Справа ў тым, што яна дастаўляла паштовы груз у адну з арганізацый, дзе ішла будоўля, аступілася і звалілася ў катлаван, атрымала пералом аднаго з пазванкоў. Згадвае: «Ляжу, нада мной доктар схіліўся, пытаю: «Ну што, доктар, мабыць, памру?» — «Не, пражывеш сто гадоў і дзве гадзіны». — «А навошта яшчэ дзве гадзіны?» — «На астыванне». — доктар з гумарам быў. Не ўгадаў: пражыла ўжо сто гадоў і два месяцы, і яшчэ, можа, трошкі працягну», — смяецца Ніна Сямёнаўна.

А тады яна доўга вылузвалася з немачы. Пяць гадоў была інвалідам другой групы, два гады — на трэцяй групе. Спачатку нават узнімалася пытанне, каб сына адправіць у дзіцячы дом, ледзьве адстаяла. Калі выйшла на працу, у сваім калектыве ёй знайшлі работу па сіле, працавала на складзе. Вырас сын, атрымаў адукацыю, стварыў сям'ю. Цяпер у Ніны Мартынюк два ўнукі, сямёра праўнукаў. Яна паказвае свой альбом, дзе ёсць фотаздымкі маладых гадоў. Кажа, што беражліва захоўвае фотакарткі, і не разумее адну сваю праўнучку, якая скептычна ставіцца да калекцыяніравання фота. «У мяне шасцігадовы праўнук ёсць. Ён абдыме мяне, бывае: «Бабуля, я цябе так люблю, але ты нікому не кажы, гэта наш сакрэт». Дык вось вырасце ён, мяне не будзе, можа, калі гляне, згадае гэту бабулю».

Для яе галоўная каштоўнасць — сям'я. Старэйшай праўнучцы, студэнтцы, 22 гады. Ніна Сямёнаўна кажа, што не супраць была б дачакацца прапраўнука. Цяпер яна жыве з сынам Георгіем Георгіевічам, які таксама на пенсіі. І заўсёды ўспамінае свой працоўны калектыў. Гаворыць, што на іх пошце працавалі цудоўныя людзі. Яны заўсёды былі гатовыя падтрымаць. І цяперашняе пакаленне паштавікоў — вартыя сваіх папярэднікаў. Не забываюць ветэрана, часцяком завітваюць, каб павіншаваць са святам, пацікавіцца здароўем, пагаварыць. Вось гэтым разам мы прыйшлі да Ніны Сямёнаўны разам са старшынёй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Ірынай Батура. Ірыну Мікалаеўну Ніна Сямёнаўна сустракала як найлепшую сяброўку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



# ЦЕПЛЫНЯ «СНЕЖНАЙ КАРАЛЕВЫ»

## У Беларускім дзяржаўным тэатры лялек дзетак вучылі чытаць казкі

**З дзяцінства ў нас закладзена думка пра тое, што ў пераднавагодні час магчымыя цуды, таму ёсць імкненне стварыць іх найперш для малых. Цікаўныя бацькі ведаюць: каб у дзіцяці было сапраўднае адчуванне казкі, трэба звярнуцца па дапамогу да прафесіянальных чараўнікоў. І тут адкрываюцца дзіўныя магчымасці. Бо амаль усе тэатры Беларусі ў святочна-калядны час запрашаюць на прэм'еры навагодніх казак.**

У Беларускім дзяржаўным тэатры лялек напрыканцы года прапанавалі падарожжа «За снежнай каралевай» для малых ад шасці гадоў. Вялікі казачнік Ханс Крысціян Андэрсэн, яго гісторыя з вечным і вельмі чалавечым сюжэтам, дзе перамагае дабро, здавалася б, не для самых маленькіх. Але ж як паказаць... І гэта першае чараўніцтва.

На малой сцэне тэатра атмасфера камерная, нават больш сямейная. Адлегласць паміж гледачамі і сцэнічнай пляцоўкай адсутнічае, дзеткі могуць сядзець на лаўках побач з дарослымі альбо размяшчацца ўнізе на мягкіх падушках-каменчыках — і тады яны фактычна прысутнічаюць у казцы. У іх перад самымі вачыма з'яўляецца чароўны свет. Адкрываецца кніга з казкай Андэрсэна! «Чытайце!» — прапануюць артысты. Імгненне паўзы — і казку пачынаюць распавядаць, ілюструючы раскрытымі старонкамі кнігі. З іх паўстаюць горад (у голас можна называць варыянты!), дамы Кая і Герды, дрэвы і кветкі, рэчка, замак, лес з разбойнікамі, снежнае каралеўства...

Ёсць такія кніжкі-раскладушкі, калі старонкі прарэзанай паперы складваюцца ў вобразы, якія набываюць форму, — малым цікава іх гартаць і даведвацца пра герояў. А калі гэтая кніга вялікая? Яе з цяжкасцю кладуць на ўмоўны стол пад лямпамі. А ў спектаклі яна яшчэ і падзелена на тры тамы... Уявіце колькасць вобразаў, што вырастаюць з паперы, — пра кожны паклапацілася мастак-пастаноўшчык Вольга Дваравая. Выявы па стылістыцы падобныя на «казачна-мульцяшныя», персанажы мілыя, прыцягальныя, нават злая каралева падаецца прыгожай паненкай. А вось тое, як папяровыя выявы і фігуркі ўзаемадзейнічаюць у спектаклі, трэба бачыць на свае вочы. Імі кіруюць маладыя акцёры — Аляксандра Лакуціна і Багдан Карташоў. Яны ж удваіх агучваюць усіх герояў, і мы нібыта чуем розныя галасы, казка-кніжка сапраўды ажывае. І чамусьці няма сумневу ў тым, што пасля дзеці захочуць пачытаць штосьці самі, — другі цуд, закладзены спектаклем.



Калі знаёмства з казкай адбылося, то застаецца пытанне: а чаму ж толькі адзін персанаж набыў аблічча не папяровай, а рэальнай лялькі — таямнічы троль? Ён скача па кнізе і распавядае, як стварыў чароўнае люстра, што разбілася, а яго рэшткі трапілі ў сэрца і вока Кая. Падобна, пытанне больш цікавіла дарослых, а малыя зразумелі: гэта быццам бы іншая казка...

І сапраўды, «За снежнай каралевай» — другі спектакль галоўнага рэжысёра тэатра Яўгена Карняга паводле Андэрсэна ў 2024 годзе, першай была пастаноўка для дарослых. Але ж разумець гэтага казачніка трэба вучыцца з маленства і не забываць на працягу жыцця: гэта пра цуды любові, якая так усім патрэбна.

Кожнае дзіця ў гэты час мае найгалоўнейшае жаданне: каб мама з татам былі побач. А тэатры — чараўнікі, якія дапамагаюць яго здзейсніць праз спектаклі для сямейнага прагляду. Бо малое так ці інакш возьме з сабой кагосьці з дарослых. І вось цуд галоўны: паспрабуйце здабыць квіткі на паказы святочных казак на найбліжэйшыя тыдзеньдва! Гэта нерэальна. Але радасна, што нашы тэатры ідуць насустрач дзецям і іх бацькам: ладзяць на дзень па некалькі паказаў казак, прычым з перадсвяточнымі прадстаўленнямі каля ялінкі.

**Ларыса ЦІМОШЫК,**
**фота аўтара.**


Результаты проведения рекламной игры

## «Тысячи причин подключиться на life:)»

**Организатор рекламной игры** – ООО «Оджей групп», УНП 192479466, зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 20.05.2015 года № 294 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей. Регистрационный номер: 192479466.

**Местонахождение Организатора:** 220073, г. Минск, пр-т Машерова, д. 15, корп. 1, каб. № 2, этаж 2, Республика Беларусь.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** Свидетельство о государственной регистрации № 4451 от 23.07.2024 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Территория проведения рекламной игры**: Республика Беларусь.

**Срок проведения рекламной игры:** с 29.07.2024 г. по 04.02.2025 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**Место и дата проведения розыгрыша:** г. Минск, пр-т Машерова, д. 15, корп. 1, каб. № 2, этаж 2.

| Розыгрыш | Дата розыгрыша | Розыгрыш | Дата розыгрыша |
|---|---|---|---|
| 1 | 07.08.24 | 10 | 09.10.24 |
| 2 | 14.08.24 | 11 | 16.10.24 |
| 3 | 21.08.24 | 12 | 23.10.24 |
| 4 | 28.08.24 | 13 | 30.10.24 |
| 5 | 04.09.24 | 14 | 06.11.24 |
| 6 | 11.09.24 | 15 | 13.11.24 |
| 7 | 18.09.24 | 16 | 20.11.24 |
| 8 | 25.09.24 | 17 | 27.11.24 |
| 9 | 02.10.24 | 18 | 04.12.24 |

**Количество человек, принимавших участие в розыгрышах:** 6 692 (шесть тысяч шестьсот девяносто два) человека.

**По итогам розыгрышей** был разыгран призовой фонд общим размером 50 015,26 руб. (пятьдесят тысяч пятнадцать белорусских рублей 26 копеек). Призовой фонд разыгран полностью.

**Результаты розыгрыша:**

Официальные результаты розыгрыша призов размещены на интернет-сайте **life.com.by.**

**«Приз 1»** в количестве 17 шт.: **подарочный сертификат в интернет-магазин life:) стоимостью 2 000,00 руб. + денежные средства в размере 267,77 руб. выиграли:** Зелянин Анатолий Леонидович, Линкевич Серафим Сергеевич, Черноокая Диана Александровна, Гончарёнок Сергей Михайлович, Крюкова Ирина Сергеевна, Соболевская Алия Мирхатимовна, Матвеева Ольга Николаевна, Журавлёв Александр Михайлович, Такушевич Андрей Вячеславович, Короткевич Ольга Николаевна, Лешко Андрей Францевич, Луданик Анастасия Ивановна, Сапега Анна Михайловна, Ярошук Эдуард Юрьевич, Дьяченко Виталий Алексеевич, Шакунов Сергей Анатольевич, Урбанович Анастасия Александровна.

**«Суперприз»** в количестве 1 шт.: **главный денежный приз 10 000 руб. стоимостью 10 000 руб. + денежные средства в размере 1 463,17 руб. выиграл:** Фей Евгений Михайлович.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Телефон для справок **8 (029) 396-40-80,**
с 09:00 до 20:00 в будние и выходные дни, без обеда.

*Правила рекламной игры были опубликованы в выпуске газеты «Звязда» от 25.07.2024 г.*



## МОЗЫРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 6 февраля 2025 г. проводит аукционные торги по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома на территории Мозырского района Гомельской области

| Местоположение не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка | Сведения о предмете аукциона | | Сведения об участке (ограничения в использовании, наличие коммуникаций) | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, вносимого участником, руб. | Затраты на подготовку документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом | Земельный участок | | | | |
| **Гомельская область, Мозырский район, Козенский с/с, д. Лучежевичи, ул. Речная, 6** | Наружная площадь – 260 м$^2$, готовность – 8 %, составные части и принадлежности – хозяйственная постройка | Площадь 0,1499 га, кадастровый номер 323581202601000170, вид права – частная собственность, целевое назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | Имеется возможность подключения к следующим инженерным коммуникациям: сетям электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, связи. Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранных зонах объектов газораспределительной системы, на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах) | 19578,11, в том числе: 13177,38 – не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома; 6400,73 – земельного участка | 1957,81 | 3240,74 (без учета расходов по размещению извещений в СМИ) |

Организатор аукционных торгов – Мозырский районный исполнительный комитет.

Извещения опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by, главного управления землеустройства Гомельского областного исполнительного комитета http://gomeloblzem.by, Мозырского районного исполнительного комитета http://mozyrisp.gov.by/ru, газетах «Звязда».

Аукцион состоится **6 февраля 2025 г. в 10.00** в Мозырском районном исполнительном комитете по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пл. Ленина, 16, малый зал заседаний, 1-й этаж, при наличии не менее двух участников на лот. Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), также в аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующие заявления об участии в аукционе, а также заключившие с Мозырским районным исполнительным комитетом соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы для участия в торгах принимаются с даты опубликования объявления о проведении аукциона по рабочим дням с 09.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до14.00) по **31 января 2025 г.** включительно в управлении землеустройства Мозырского районного исполнительного комитета (г. Мозырь, пл. Ленина, 16, кабинет 310, контактный телефон 80236300194.

Кроме того, в комиссию представляются:

документ (с отметкой банка), подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Мозырского районного исполнительного комитета BY20AKBB364142 30001013300000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400036117, код назначения платежа OTHR 90101;

информацию о реквизитах банка и номере текущего (расчетного) счета открытого для возврата внесенных задатков;

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией по предмету аукциона и его месторасположением в срок по 31 января 2025 г. включительно. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии проектно-изыскательских работ.

Заключительная регистрация участников аукциона осуществляется **с 09.00 до 09.30 6 февраля 2025 г.** по адресу: г. Мозырь, пл. Ленина, 16, кабинет 310, 3-й этаж. Граждане, негосударственные юридические лица, которые не прошли заключительную регистрацию к участию в аукционе не допускаются.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления Мозырским районным исполнительным комитетом рассрочки ее внесения);

возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией возникновения права на земельный участок;

разработать и утвердить в установленном законодательством порядке в срок, не превышающий один год со дня возникновения права на земельный участок, проектно-сметную документацию для завершения строительства приобретенного незавершенного незаконсервированного капитального строения. Завершение строительства одноквартирного жилого дома осуществить на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

юридическому лицу в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня утверждения проектно-сметной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту;

соблюдать права и обязанности землепользователя, предусмотренные статьями 84 и 85 Кодекса Республики Беларусь о земле.

# НОВЫ ГОД НА МЕСЯЦЫ, ТОСТ ЗА ВАЛЯР'ЯНКАЙ



## Навагоднія прыгоды вядомых дзеячаў культуры

**У нас ёсць пэўны стэрэатып, як трэба сустракаць Новы год: прыбраная ёлачка, багаты стол, шампанскае ў келіхах, радасныя госці... Але ў жыцці не заўсёды атрымліваецца менавіта так. А часам атрымліваецца і зусім не так... Давайце паслухаем, як дзіўна сустракалі Новы год вядомыя дзеячы беларускай культуры...**

### Язэп Драздовіч вандраваў па Месяцы

Легендарны мастак-вандроўнік Язэп Драздовіч падарожнічаў не толькі па любай Беларусі, але ў сваіх «візіях» і па іншых планетах... Зарабляў, ходзячы па сялянскіх хатах, дзе распісваў дываны і шафы, а для душы адлюстроўваў у словах і фарбах сцэны жыцця на Месяцы, Марсе і Сатурне... 1 студзеня 1933 года ён занатоўвае ў сваім дзённіку:

*«З Новым годам! Прыйдзі, Новы год, і не крыўдзі мяне нэндзай-бядою, так як папярэднія — старыя... Прынясі мне добрыя памысныя варункі жыцця дзеля працы маёй на карысць людзём праз навуку, праз прыгожае слова і прыгожыя творы мастацтва!*



*Праз увесь дзень сяджу дома. Сам зварыў сабе есць — падабедаў і пішу... Пішу — занатоўваю свае лунныя падарожжы — «На Арыяполь».*

Так што ў тую навагоднюю ноч Язэп Драздовіч вандраваў па Месяцы, пра што складае новае апавяданне "У лабірынтах Чорнай Лопаўкі" (так ён называў «убачаную» ім лакацыю на Месяцы) і малюе план месяцовага горада Трывежа.

### Алесь Гарун рэфлексаваў на самоце

Беларускі паэт Алесь Гарун 1916 год сустрэў у высылцы, куды трапіў за рэвалюцыйную дзейнасць. Не прайшло і паўгода, як удалося з рабочага залатых капальняў Ленскай золатапрамысловай акругі стаць памочнікам наглядчыка горных рабочых. Паэт хварэў на сухоты, марыў вярнуцца на радзіму. Як прайшоў яго Новы год, адлюстроўвае верш:

*«У ноч на Новы год*
*Сяджу я адзін у святліцы*
*З душою, агорнутай сумам.*
*Гадзіннік стары на паліцы*
*Ўтуруе самотлівым думам.*

*Усё прамінае у часе:*
*Няволя, самота, пакута, —*
*А йшчэ што у долі ў запасе?*
*«Дванаццаць гадзін і мінута».*

*Жыццё уцякае нязначна,*
*Па хвілечцы хвілька. Чаму ты*
*Не ловіш яго, неабачны?*
*«Дванаццаць гадзін, дзве мінуты».*

### Віктар Грамыка спяваў гімн

У нумары «Звязды» за 1 студзеня 1968 года надрукавання навагоднія віншаванні знакамітых дзеячаў культуры, што наведалі рэдакцыю. Народны мастак Беларусі Віктар Грамыка, які праславіўся карцінамі на тэму Вялікай Айчыннай вайны, распавёў тады наступнае: *«Перад маімі вачыма паўстае сустрэча 1944 года ў партызанскім атрадзе. Было гэта ў вёсцы Лабанаўшчына на Полаччыне. Я працаваў тады ў падпольнай газеце «Народны мсцівец», дарэчы, з вашым звяздоўцам, добрым журналістам і арганізатарам, Францам Іосіфавічам Ляпескім... Мы шмат выдавалі лістовак, друкавалі таксама газеты іншых падпольных райкомаў партыі. За некалькі тыдняў да Новага года прынялі па радыё і апублікавалі тэкст Гімна Савецкага Саюза. Але музыкі не ведалі, і на сустрэчы Новага года пачалі спяваць Гімн на мелодыю «Варшавянкі». Ноччу мы выйшлі на вуліцу і вельмі здзівіліся, калі пачулі, што недзе на другім канцы вёскі таксама спяваюць Гімн на мелодыю «Варшавянкі». Мы потым часта ўспаміналі гэты выпадак, бо зразумелі, якое гэта было вялікае сведчанне любві народа да сваёй радзімы».*

### Іван Міско піў валяр'янку

Народны мастак Беларусі Іван Міско сябраваў з артыстычнай сям'ёй Яроменкаў.

*«З Яроменкі-старэйшага маску нават зняў, хацеў ляпіць яго партрэт, ужо і дамовіўся на сустрэчу. Але ў той жа дзень, што ён павінен быў у майстэрню прыехаць, ён памёр. Памятаю выпадак, калі мы з Яроменкам-старэйшым апынуліся ў лечкамісіі ў адной палаце. Новы год, а нас не пусцілі дадому. Роўна ў дванаццаць ночы нам дактары налілі валяр'янкі, мы ўсталі, чокнуліся, павіншавалі адзін аднаго і ляглі спаць».*

### Фердынанд Рушчыц перапісваў карціну

1895 год мастак Фердынанд Рушчыц сустрэў у якасці студэнта Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, яго настаўнікам быў Іван Шышкін. А на святы мастак едзе на радзіму і занатоўвае ў дзённіку:

«Новы год заспеў мяне ў Мінску. На нейкія тыдні два вымушаны забыцца пра сваю майстэрню, увесь мой час заняты падрыхтоўкай да студэнцкага балю і студэнцкімі забавамі, якіх у Мінску дастаткова і якія зрэдку лічу для сябе неабходнымі.

Студэнцкі баль. Людзей крыху менш, чым летась. Танцавалі з ахвотай, аж да 8-й. Падчас балю сур'ёзных непаразуменняў не здарылася, сумна, балі нашы занепадаюць».

А вось новае стагоддзе і 1900 год Рушчыц сустракае ў роднай сядзібе Багданава за працай. 31 снежня 1899 года ён запісвае: «Перарабляў і перарабляю «Вечар». Круціўся на адным месцы. Нарэшце прыйшла думка перапісаць ваду, і гэта поўнасцю змяніла карціну».

### Віктара Шніпа не пусцілі ў інтэрнат

Паэт Віктар Шніп успамінае: «У нас дома ў вёсцы ў маім дзяцінстве на Навагоднюю ялінку кожны год чаплялі ўсё меней і меней купленых цацак. Ставілі ялінку, разбіралі, і цацкі біліся. Новых не было дзе купіць. І калі мне было гадоў дванаццаць, а сястры Валі адзінаццаць, мы пачалі самі рабіць цацкі на ялінку. Ляпілі з пластыліну і воску, выразалі з паперы гірлянды, сняжынкі. Калі мне было чатырнаццаць гадоў, дык мы перад Новым годам зрабілі хатнюю насценную газету. Я пісаў вершы і смяшынкі, а сястра з братам малявалі. Пачытаць нашу насценную газету прыходзілі не толькі нашы сябры і аднагодкі, а таксама дарослыя суседзі».

А вось калі паэту было шаснаццаць, ён паступіў у Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і пасяліўся ў інтэрнаце на вуліцы Змітрака Бядулі. Цяпер Новы год прайшоў зусім іначай:

«Да пачатку 1977 года застаецца гадзіны чатыры. З сябрамі скінуліся на дзве пляшкі кубінскага рому. У краму выпала ісці мне. Пайшоў. Купіў. Вяртаюся ў інтэрнат. На вахце аблава — фізрук з ваенруком правяраюць сумкі. «Куды нясеш пітво?» — грозна пытаецца ваенрук. Я разгубіўся толькі на момант: «Еду ў госці да дзядзькі з цёткай. Для іх купіў...» — «Раз для сваякоў купіў, то і едзь да іх!» — сказаў фізрук і не прапусціў мяне ў інтэрнат. Давялося Новы год сустракаць у дзядзькі Барыса і цёткі Галі».

### Хведар Жычка стаяў на пасту

Паэт Хведар Жычка — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, служыў у Балтыйскім флоце, мабілізаваўся ў 1951-м. А ў адным са сваіх вершаў апісаў сваю навагоднюю ноч у якасці вайскоўца, але ўжо мірнага часу:

*«Адзначыць Новы год бакалам*
*не дазваляе мне Статут.*
*Ды што бакал той?*
*Хіба мала*
*стаяць сягоння на пасту?!*

*Сасонка мне згінае постаць*
*і зычыць шчасця Млечны Шлях.*
*А за мяне падыме тосты*
*уся Савецкая зямля.*

*Я — на пасту.*
*Я ганаруся*
*вялікім іменем — салдат,*
*і ў дождж, і ў град, і ў завіруху*
*загад Радзімы — ёсць загад!*

*Вартую ноччу навагодняй*
*спакой савецкіх берагоў.*
*Няхай багатым на рэкорды,*
*шчаслівым будзе Новы год!»*

Няхай жа шчаслівым новы год будзе і для ўсіх вас, шаноўныя чытачы! А святы няхай запомняцца незвычайнымі, але толькі прыемнымі ўражаннямі!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**


**ООО «СидНеА» организует конкурсные торги**

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб., эквивалентная курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **29.01.2025 10.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-798197609 по адресу: г. Минск, ул. Карвата, д. 10В, кв. 67 | 64900 | 42,2 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 11.00** | Продажа участка с кад. ном. 624882000055000114 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Стрелец-2014», 90 | 18900 | 0,1044 га | 10 | 90 |
| **29.01.2025 11.30** | Продажа дома с кад. ном. 622281300007000022 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Демидовичский с/с, СТ «Чистая Надзея» | 94900 | 0,1014 га | 10 | 90 |

**Повторные конкурсные торги**

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб., эквивалентная курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **29.01.2025 12.00** | Продажа 2/3 жилого дома. с инв. № 600/С-58737 по адресу: Минская обл., Минский р-н Ждановичский с/с, д. Дегтярёвка, ул. Молодежная, д. 14 | 40000 | 43,6 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 12.30** | Продажа многофункционального комплекса с инв. № 600/С-147470 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Приморье, ул. Центральная, 5В | 1500000 | 1329,2 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 13.00** | Продажа дома с инв. № 500/С-33313 по адресу: г. Минск, пер. Радиаторный 1-й, д. 19 | 399000 | 327,9 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 13.30** | Продажа дачного дом с инв. № 614/С-41474, по адресу: Минская обл., Смолевичский р-он, Усяжский с/с, СТ «Чайка-81», д. 45 | 34900 | 47,7 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 14.00** | Продажа участка с кад. ном. 622283000010000121 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Путчинский с/с, СТ «Птич-2» Дзержинский р-н, 72 | 16000 | 0,105 га | 10 | 90 |
| **29.01.2025 15.00** | Продажа квартиры с инв. № 600/D-123491 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Слободщина, ул. Славянская, д. 23, кв. 1 | 169900 | 150,5 кв. м | 10 | 90 |
| **29.01.2025 16.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708130615 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 122-485 | 137000 | 77,2 кв. м | 10 | 90 |

Торги состоятся по адресу: **г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.** Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14 MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок **(+37529) 171-50-50.**

УНП 193734126

**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «ХАВСТРУД»**

*(УНП 193575621, г. Минск, ул. Сухая, 4, пом. 42).*

***Дата и время проведения торгов*: 31 января 2025 года.**

Начало – 11.00. Заявки принимаются с 31 декабря 2024 года по 29 января 2025 года.

***Место проведения торгов:***
г. Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «ХАВСТРУД» (УНП 193575621),** в лице ликвидатора – ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт», директор Колыско А.А.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интеренет-сайте **https://specrealization.by.**

*Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 09.00 до 17.00) +375296847176.*

Хто каго?

# СВЕТ ЗАХАВАЎСЯ ТАМУ, ШТО СМЯЯЎСЯ...



**...З дыялогаў: «Скажыце, вы ўжо чыталі каму-небудзь свае вершы?» — «Не. А чаму вы пытаецe?» — «Ды проста... Бачу — у вас вока падбітае...»**
**Значыць, схлусіў чалавек: чытаў усё ж такі?! І, напэўна, здзяцінеўшы, хацеў з табурэткі?..**
**А далей што — «прамахнуўся», не ўзлез?**
**Ці потым зваліўся? А можа, выбілі яе з-пад ног, бо дрэнныя былі вершы? Альбо, наадварот, вельмі добрыя? За іх жа таксама магло перапасці?..**

Шмат пытанняў! І задай іх газета сваім чытачам, адказаў — прычым трапных, дасціпных, вершаваных (багаты наш край на паэтаў!) — атрымалі б у разы болей! Нездарма ж са старонак «Звязды» не сыходзіць конкурс на найлепшы подпіс да здымка.

І ўсё ў ім так, як належыць: журы, адборы, вынікі, пераможцы... Адзінае — тыя, найбольш удалыя подпісы, непазбежна адрываюцца ад здымкаў: «пазлы сходзяцца» хіба напрыканцы, у апошнім нумары года! Такім чынам «Хто каго?» — 2024. Найлепшае»: глядзім на здымак, чытаем подпісы, усміхаемся... Прыгажэм, лечымся і тым самым (даказана!) падаўжаем сваё жыццё.

## «НА ПАЛЯВАННЕ ЯСЬ ХАДЗІЎ...»

*Можна верыць*
*ці не верыць —*
*Шмат хто*
*ў лесе браканьерыць:*
*То страляюць,*
*то балююць...*
*Дый і на іх цяпер палююць:*
*Глянь — вавёрка мае ўжо,*
*Нехай фота — ды ружжо!*
**Мікалай Касмачэўскі,**
*г. Навапалацк.*

*У лясгасе*
*пад Мар'інай Горкай*
*Ёсць у штаце*
*фатограф вавёрка:*
*Не касых*
*ды рагатых здымае —*
*Тых, хто смецце*
*паўсюль раскідае...*
*Бачыў сам,*
*бо хадзіў па ўзгорках:*
*Чыста ў лесе*
*пад Мар'інай Горкай!*
**Дзяніс Андросік,**
*г. Узда.*

*На паляванне Ясь хадзіў,*
*Як заўсёды, з «Ніканам»:*
*І вавёрку пакарміў,*
*І заданне выканаў!*
**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*



## «ЗАВАЛІЎ НАС СНЕЖАНЬ СНЕГАМ»

*Сказаў правіцель*
*Саламон:*
*Што ўсякай справе —*
*пэўны час.*
*Калі казаў, не ведаў ён,*
*Што часам*
*правіць КАМУНГАС,*
*Там не чыталі Саламона,*
*І гэты цар ім не ўказ.*
**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*




*Асаблівасць нашай мовы:*
*Шмат значэнняў*
*маюць словы.*
*У касавіцу людзі косяць*
*І дажджу тады*
*не просяць:*
*Сена трэба насушыць,*
*Каб дугою не касіць...*
*А грыбы...*
*Дай бог — касою!*
*Але ж гэта —*
*не зімою,*
*Бо зімою косіць грып:*
*Сцеражыся,*
*каб не ўліп!*
**Сужэнцы Астроўскія,**
*г. Мінск.*

*Плакат на мове роднай —*
*Прыемна паглядзець!*
*Таму зімой і летам*
*Дай бог яму вісець!*
**Мікалай Старых,**
*г. Гомель.*

## «ДЗЕ ТЫ, ПРЫНЦ? — чакае Тома...»

*Вясна...*
*Спрадвечныя турботы*
*Вяскоўцам*
*часу нестае,*
*Прыселі вось*
*пасля работы,*
*А думкі ў кожнага свае:*
*Яна — лунае ў аблоках...*
*Хлапец,*
*падсеўшы не здаля*
*Пра... гной ды бульбу*
*мае клопат:*
*Даўно прагрэлася зямля.*
**Леакадзія Козел,**
*Валожынскі раён.*

*«Дзе ты, прынц? —*
*чакае Тома, —*
*Ці банкір...*
*З палацам-домам,*
*З мерседэсам, без заган*
*І каб грошай чамадан,*
*Каб разумны,*
*каб прыгожы...»*
*Сохне пабачкі Сярожа:*
*Тому ён здаўна кахае*
*Ды... не прынц,*
*хоць трактар — мае.*
**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

*— Ты дастанеш*
*з неба зорку?*
*— Можа, сем?*
*Схаджу, куплю.*
*— Звозіш летам*
*на Маёрку?*
*— Я Браславы*
*больш люблю.*
*— Пачытаеш, можа,*
*вершы?*
*— Кніг з сабою*
*не нашу.*
*— Ну скажы:*
*«Не бачыў*
*лепшых!»*
*— Не трындзі!*
*Дабром прашу!*
**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*



## «ТАТЫ, МАМЫ ДО ЎЖО ХЛУСІЦЬ...»

*Дух Гаюн*
*гадоў сем запар*
*Ад жывёл прымае... хабар:*
*Малако прыносяць козы,*
*Бабры — венікі з бярозы...*
*А што бусел можа даць?*
*Дык нашто яго пускаць?..*
**Мікалай Старых,**
*г. Гомель.*

*Сам я —*
*шчыра прызнаюся —*
*Быў такім, як гэты бусел:*
*Ля вакон-дзвярэй*
*тaптаўся,*
*Лішні раз зайсці баяўся...*
*Мы такія —*
*усё стрываем:*
*Не панове — пачакаем.*
**Мікалай Камароўскі,**
*г. Орша.*

*Нараджальнасць у краіне*
*Стала падаць*
*з году ў год...*
*У трывожную часіну*
*Люд паклікалі на сход.*
*Конкурс там жа аб'явілі,*
*Што палепшыць?*
*Як зрабіць?*
*...Буслу ўрэшце*
*план спусцілі:*
*«Дзесяці мільёнам быць!»*
**Раіса Ісакава,**
*Чавускі раён.*

*Таты, мамы,*
*до ўжо хлусіць,*
*Што дзяцей*
*прыносіць бусел.*
*Я праверыў гэту казку:*
*Прычапіў буслу*
*«падвязку».*
*Ён — слабак,*
*ляцець не можа*
*Нават з дзедавым*
*галёшам,*
*А ўжо несці немаўля...*
*Гэта — чыстая брахня.*
**Сужэнцы Астроўскія,**
*г. Мінск.*



### Замест пасляслоўя

**Апошні (сёлета) конкурсны здымак (гл. нумар «Звязды» за 4 снежня альбо сайт — «Калейдаскоп», «Хто каго?»), змешчаны амаль месяц таму, першыя дзясяткі подпісаў пошта ўжо прынесла. Мы ўпэўненыя, што будуць наступныя. Пішыце! Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў...**

**Валянціна ДОЎНАР.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК 754 мм рт.сл. | +2..+3°С | +1..+3°С |
| ВІЦЕБСК 750 мм рт.сл. | 0..+2°С | 0..+2°С |
| МАГІЛЁЎ 753 мм рт.сл. | +3..+4°С | +1..+2°С |
| ГОМЕЛЬ 758 мм рт.сл. | +2..+4°С | +2..+4°С |
| ГРОДНА 755 мм рт.сл. | +1..+3°С | +3..+4°С |
| БРЭСТ 756 мм рт.сл. | +3..+5°С | +2..+4°С |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік у 1.26.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура
— умераная геамагнітная бура

**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| МАСКВА | +4..+6°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | -2..0°С |



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Надвор'е

## У новы год — з плюсам

### Прыйдзе чарговае пацяпленне

**Як адзначылі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, 31 снежня надвор'е ў краіне будуць вызначаць франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з Заходняй Еўропы.**

Сёння чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць апады ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У начныя і ранішнія гадзіны на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 1 марозу да 4 цяпла, а максімальная днём — ад нуля да плюс 6 градусаў.

1 студзеня на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць апады (дождж, мокры снег). Ноччу і раніцай у асобных раёнах краіны будзе адзначацца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні парывісты, ноччу месцамі, днём у многіх раёнах краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ў раёне нуля (ад мінус 2 да плюс 2 градусаў), а максімальная днём — ад 1 да 6 цяпла.

У чацвер нават ноччу з плюсам, а днём наогул амаль вясна. А ўсё таму, што 2 студзеня на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць апады ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер заходні чвэрці парывісты, у многіх раёнах краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да плюс 4 градусаў, а ўдзень — 1—8 цяпла.

### А яшчэ

У навагоднюю ноч можна будзе ўбачыць палярныя зззянні з-за выкідаў мас ад магутных успышак на Сонцы.

Раніцай 30 снежня былі зафіксаваныя дзве новыя ўспышкі вышэйшага рэнтгенаўскага класа X. Выбухі на Сонцы адбыліся на яго заходняй частцы ў зоне, якая мае ўплыў на Зямлю. У Расіі і Беларусі навагодняя ноч можа апынуцца маляўнічай і запомніцца палярнымі зззяннямі. У якіх рэгіёнах нашых краін іх убачаць, залежыць ад магутнасці выбліскаў на нябесным свяціле.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Наступны нумар выйдзе 3 студзеня 2025 года.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 722. Індэкс 63850. Зак. № 2863.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2024 года.